

**Выратавальніца Рут**

СТАР. 5



**На вакзале — бяспечна**

СТАР. 6



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЖНІЎНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 164 (28022) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ГАЮЧАЯ ВАДА УСПЕНСКАЙ КРЫНІЦЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Гэтая крыніца знаходзіцца ва Успенскім мужчынскім праваслаўным манастыры ў Пустынках Мсціслаўскага раёна. Паданне сведчыць, што менавіта дзякуючы ёй і з'явіўся манастыр: мясцовы князь Сымон Лугвен прамыў вадой з крыніцы хворыя вочы і зноў пачаў бачыць, пасля чаго і заснаваў тут манастыр. Да крыніцы круглы год па жывую ваду прыязджаюць людзі і з Беларусі, і з Расіі, балазе, мяжа зусім недалёка — і кіламетра няма. Маладая маці Ірына Чэчыкава з маленькай дачкой (на фота), напрыклад, прыехала з гарадскога пасёлка Манастыршчына Смаленскай вобласці.*

*Асабліва шматлюдна будзе ля крыніцы сёння — у свята Успення Багародзіцы. Людзі шчыра вераць, што вада і малітва дапамогуць. А вера — вялікая сіла.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў:**

*«Усе дзеці, якія пражываюць і навучаюцца на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, якія маюць патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні, забяспечваюцца пуцёўкамі ў поўным аб'ёме. Юным жыхарам чарнобыльскіх рэгіёнаў у 2011—2015 гадах выдзелена 451,3 тысячы пуцёвак на аздараўленне, у тым ліку па выніках 2015-га іх уладальнікамі стануць 81,5 тысячы дзяцей. Яны на працягу ўсяго года накіроўваюцца ў дзіцячыя рэабілітацыйна-аздараўленчыя цэнтры, санаторыі, а ўлетку — і ў лагеры. Для такой катэгорыі дзяцей цэнтрам штогод набываюцца пуцёўкі ў санаторна-курортныя арганізацыі рэспублікі, размешчаныя на Рыжскім узмор'і і Чарнаморскім узбярэжжы, дзе маюцца ўнікальныя кліматычныя і прыродныя фактары».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17667,00 | ▼ |
| Еўра | 19979,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 261,27 | ▲ |
| Укр. грыўня | 841,29 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

## ■ Добрая навіна

# ШЧАСЦЕ Ў КУБЕ

**Злата, Ксенія і Лізавета — такія імёны далі сваім дочкам Ігар і Алена ШМУРАДКО. Адразу тры дзяўчынкі на Гомельшчыне сёлета нарадзіліся ўпершыню. Ім дапамаглі з'явіцца на свет у Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы №2. 22-гадовая матуля гаворыць, што дачушкі, якія спачатку былі вельмі маленькімі (1360, 1530 і 1990 грамаў), адчуваюць сябе добра.**



Фота БЕЛТА.

— Муж, — адзначае Алена, — заўсёды казаў, што хоча мець траіх дзяцей. Жартаваў, што трэба гэта зрабіць за пяцігодку, але атрымалася раней, чым планавалі.

Шчаслівыя бацькі, якія згулялі вяселле ў кастрычніку 2014 года, думаюць пра пераезд у Светлагорск, адкуль Алена родам. Там будуць будаваць жыллё.

**Галоўны акушэр-гінеколаг Гомельскай вобласці Аксана ЦЯСЛОВА** гаворыць, што тройні ва ўсім свеце нараджаюцца адна на прыкладна 10 000 родаў. Летась па вобласці іх было тры. Аднак шматплодная цяжарнасць, у тым ліку штучная, а не толькі спантанная, як у гэтым выпадку, гарантуе павышаную рызыку самых розных ускладненняў:

— Мы робім усё, каб выжыла кожнае немаўля, з якімі б паталогіямі яно ні нарадзілася. Кожны выпадак для нас унікальны, бо выхадзіць такое дзіця — вялікая сумесная праца медыкаў і бацькоў.

СТАР. 4

## ■ Надвор'е

# ВЕРАСЕНЬ ПАЧНЕЦЦА ЦЯПЛОМ

**Цёплае надвор'е захаваецца ў Беларусі да сярэдзіны наступнага тыдня, паведаміла начальнік сектара кароткатэрміновых прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Людміла ПАРАШЧУК.**

29 жніўня ноччу і раніцай месцамі па паўночным усходзе будуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Удзень істотных ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы плюс 10-17, па паўднёвым усходзе да 19 цяпла, удзень — ад 20 да 27 вышэй за нуль. 30 жніўня ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы 7-14 цяпла, удзень — ад плюс 20 да 27 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 30 цяпла.

У пачатку наступнага тыдня ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. 31 жніўня тэмпература паветра ўначы плюс 10-17 градусаў, удзень — ад 20 да 27 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 32. 1 верасня будзе такая ж тэмпература. 2 верасня атмасферны фронт, які праходзіць з Заходняй Еўропы, зноў будзе вызначаць месцамі па рэспубліцы кароткачасовыя дажджы. Услед за фронтам чакаецца паступленне больш халаднаватых паветраных мас з Балтыкі, таму тэмпературны фон пачне зніжацца: тэмпература ўначы ад 8 да 15 цяпла, удзень — плюс 18-25.

Дажджы, якія прайшлі, істотна не палепшылі сітуацыю з колькасцю вільгаці: па-ранейшаму захоўваецца дэфіцыт вільгаці ў глебе і застаецца складанай сітуацыя з пажаранебяспекай у лясах. Высокая пажарная небяспека захоўваецца ў большасці раёнаў краіны, месцамі — надзвычайная, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях надзвычайная пажаранебяспека адзначаецца на большай частцы тэрыторыі.

# НАПРУЖЫЦЦА, КАБ ВЫСТАЯЦЬ

## Прэзідэнт патрабуе надаваць асаблівую ўвагу зніжэнню сабекошту і павелічэнню экспарту прадукцыі

**Учора Аляксандр Лукашэнка наведаў прадпрыемства «Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне». Прэзідэнт, прыбыўшы на прадпрыемства, вырашыў змяніць загадзя падрыхтаваны маршрут і прайсці па тых памяшканнях, дзе яго не чакалі. Кіраўнік дзяржавы каля гадзіны аглядаў вытворчыя цэхі, унікаючы ва ўсе дэталі тэхналагічнага працэсу вытворчасці баваўняных тканін. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тым, як выканана яго даручэнне па рэалізацыі інвестыцыйнага праекта развіцця і тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемства, з фінансава-эканамічнымі вынікамі яго працы. Прэзідэнту прадставілі ўзоры прадукцыі, што тут вырабляецца.**

У сціслыя тэрміны ва ўмовах дзеючай вытворчасці была праведзена комплексная мадэрнізацыя прадпрыемства. Былі ўсталяваны машыны новага пакалення, пабудавана ўласная энергакрыніца — міні-ЦЭЦ. Мадэрнізацыя дазволіла павялічыць прадукцыйнасць працы больш чым у два разы, асвоіць выпуск новых канкурэнтаздольных відаў тканін. Тут таксама сфарміраваны ўнікальны на постсавецкай прасторы тэхналагічны працэс з магчымасцю апрацоўкі тканін з рознымі відамі аздаблення. Прадпрыемства перанесла акцэнт з вытворчасці і рэалізацыі паўфабрыкату на выпуск высокарэнтабельных гатовых вырабаў.

Прэзідэнт лічыць, што ў прадпрыемства ёсць рэзервы для зніжэння сабекошту прадукцыі яшчэ на 7-10%. Кіраўнік дзяржавы даручыў прадумаць, якім чынам гэты паказчык будзе скарачацца і далей.

У апошнія гады ББВА істотна нарошчвала экспарт прадукцыі. Так, калі ў 2011 годзе суадносіны экспарту тавараў і аб'ёму прамысловай вытворчасці складалі 9,8%, то ў 2014-м — 16,3%. У першым паўгоддзі 2015 года захавалася тэндэнцыя росту экспарту. Пры гэтым павялічыліся пастаўкі тавараў у краіны ЕС (у 3,7 раза) і ва Украіну (у 1,6 раза). Істотна скараціліся ў бягучым годзе імпартныя закупкі тавараў.

«Вы павінны больш прадаваць па-за межамі краіны, не абмінаючы ўвагай свой рынак», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы, што ў гэтым плане ён паставіў жорсткія задачы перад урадам. «Мы не павінны купляць па імпарце тое, што вырабляем самі», — заявіў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што дапушчальны ўзровень імпарту на рынку 10% для таго, каб захаваць канкурэнцыю.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне ніколі не было абдзелена дзяржаўнай падтрымкай. Яна была аказана і для мадэрнізацыі прадпрыемства. У той жа час яго кіраўніцтва падняло тэму выплаты ўзятых пад мадэрнізацыю крэдытаў. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў у найбліжэйшы час разгледзець пытанне аб павелічэнні часу іх пагашэння, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка таксама паразмаўляў з работнікамі прадпрыемства, закрануўшы актуальныя тэмы сённяшніх сацыяльна-эканамічных рэалій.

### ЧАС ПЕРААДОЛЕННЯ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сітуацыя ў свеце вельмі цяжкая: мыльныя бурбалкі, якія былі надзьмуты ў сусветнай эканоміцы, пачынаюць лопацца, бурацца фондавыя рынкі, дэвальвуюцца нацыянальныя валюты. «Гэта фінансавая вайна. Гэта ўжо эканамічная вайна. І нам у гэтай вайне трэба не аддаць сваё, нам трэба выстаяць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму напружвайцеся да мяжы. Неабходна ў працоўных калектывах наколькі магчыма напружвацца і перажыць гэты час».

«Нам трэба прайсці гэты год нармальна. Паглядзім, што будзе ў яго канцы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, у наступным годзе мы пачнём выкарабквацца з гэтага становішча, хоць мы не абваліліся так, як іншыя».

«Вы бачыце, наш найбліжэйшы партнёр, Казахстан, па-мойму, ужо тры разы за апошнія два гады абваліў, разава дэвальваваў сваю валюту. І гэта краіна, якая сядзіць на карысных выкапнях. Вы бачыце, што адбываецца ў Расіі: за апошнія два гады тры разы абвалілася валюта, і, здавалася, канца краю няма, але пайшла нейкая стабілізацыя», — канстатаваў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, сёння краіны ўжо не думаюць пра тое, што будзе ў выніку дэвальвацыі валюты, больш думаюць пра тое, «як утрымацца ў гэтым бурным патоку, не спыніць вытворчасць і хоць на мінімуме прайсці гэты перыяд».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што сённяшняя сітуацыя пераадольная, «так увесь час не будзе».

### ПАЖЫЦЬ НА СВАІМ, АДПАЧЫЦЬ ДОМА

Адказваючы на пытанне аб тым, якая будзе сітуацыя на валютным рынку, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў краіне не будзе штучна стрымліваць курс нацыянальнай валюты. «І мы гэтага не робім. Калі мы пачнём яго стрымліваць і неяк спрабаваць гэтым стрымаць інфляцыю, дапамагчы нечаму (не тыя часы), мы зноў прыйдзем да таго, што разава давядзецца на 30% дэвальваваць валюту», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што з гэтай прычыны ў краіне прытрымліваюцца плаваючага курса.

«Тое, што зрабілі зараз Казахстан і Расія, мы зрабілі раней, каб не спаліць золатавалютныя рэзервы. Балазе, трошкі золата даражэе, у нас яго, напэўна, тон пад 30, — адзначыў Прэзідэнт. — Таму мы прытрымліваемся плаваючага курса, каб прайсці гэты цяжкія часы».

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў сённяшняй сітуацыі нельга стрымліваць цэны. «Мы назіраем за цэнамі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Калі пачнём трымаць, знікнуць тавары з рынку».

«Ёсць нейкая валацільнасць, рух, — адзначыў Прэзідэнт. — Я вам клянуся, што мы нічога не робім, каб стрымліваць, узмацняць ці аслабляць нацыянальную валюту. Будзе больш валюты — будзе ніжэйшым курс, будзе высокі попыт, валюты не будзе — вы ведаеце, што тады». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што менавіта з гэтай прычыны ён патрабуе нарошчваць экспарт для прытоку ў краіну валюты.

«Шчыра кажу, калі раней мяне проста трэсла, калі я бачыў змены курсаў валют, сёння мяне больш хвалюе іншае — утрымацца б, не дэстабілізаваць становішча ў краіне», — сказаў беларускі лідар. «У свеце ідзе вайна, — сказаў Прэзідэнт. — У рэшце рэшт, хоць бы гэтая бяда нас не кранула».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў беларусам падтрымаць айчыннага вытворцу. «Давайце пажывём на сваім, што ў нашых крамах ёсць, і адпачнём гэтыя гады ў сябе, у Беларусі. Не будзем вывозіць валюту, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Не бегайце вы па гэтых абменніках. Вы ствараеце лішнія праблемы».

### ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ НЕ ЗМЕНІЦЦА, ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ ЗАХАВАЕЦЦА

Работнікаў прадпрыемства хвалявала пытанне магчымага павышэння пенсійнага ўзросту.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта тэма нават не разглядаецца. «Мы наогул да гэтага пытання не падыходзілі. Я вам шчыра сказаў, што нам пенсійны ўзрост даўно трэба было павялічыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі невысокія пенсіі, паколькі на аднаго пенсіянера прыпадае занадта мала працуючых грамадзян. «Гэта значыць, мы абцяжарваем сваіх дзяцей», — сказаў ён. «Калі вы хочаце, каб у краіне было столькі пенсіянераў на столькі працуючых, калі ласка, але пенсія будзе меншай», — дадаў кіраўнік дзяржавы. «Таму мы пенсійнае пытанне не чапаем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Маё меркаванне вы ведаеце. Але вы гэтага не жадаеце».

Кіраўніку дзяржавы было зададзена пытанне аб тым, ці захаваецца ў далейшым ільготнае крэдытаванне на будаўніцтва жылля і якія змены чакаюць беларусаў у гэтай сферы. Прэзідэнт падкрэсліў, што льготнае крэдытаванне захаваецца. «Будзе больш, значыць, больш дадзім грошай на крэдытаванне. Але сёння не да раскошы. Калі мы захаваем тыя аб'ёмы льготнага крэдытавання, што ёсць, дзякуй Богу», — сказаў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым ён звярнуў увагу на тое, што неабходна больш будаваць арэнднага жылля, бо «ў гэтым напрамку рухаецца ўвесь свет».

Сёння Прэзідэнт прадоўжыць рабочую паездку па Брэсцкай вобласці.

## КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Юрыя Амбразевіча пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры аддзяленні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацыях у Жэневе (Швейцарская Канфедэрацыя). Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы ўзгадніў назначэнне Дзмітрыя Калечыца намеснікам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Ігара Поршнева — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», Рыгора Лаўшэнкі — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі».

## АДБУДЗЕЦЦА ВІЗІТ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ Ў КІТАЙ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 1—3 верасня зробіць рабочы візіт у Кітайскую Народную Рэспубліку для ўдзелу ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да 70-годдзя перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі.**

У ходзе візіту таксама запланаваны шэраг двухбаковых сустрэч Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам КНР.

## ТРЫ Ў АДНЫМ

**Больш за 50 прадпрыемстваў Астравецкага, Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў прэзентавалі сябе на ўжо традыцыйнай, шостай, выставе «Паўночны вектар Гродзеншчыны».**

Азнаёміцца з эканамічным патэнцыялам трох раёнаў у Астравец прыехалі дэлегацыі з шэрагу рэгіёнаў нашай краіны і замежжа, прадстаўнікі бізнесу і дыпламаты з Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Кітая. Астравецкі райвыканкам заключыў дагавор аб эканамічным супрацоўніцтве з кіраўніцтвам Лідзбарскага павета Польшчы, Ашмянскі — з адміністрацыяй горада Гулбене (Латвія), Смаргонскі — з Марыямпальскім упраўленнем Літвы.

— Асноўным «драйверам» эканамічнага развіцця паўночных раёнаў Гродзеншчыны з'яўляецца, безумоўна, будаўніцтва Беларускай АЭС, якое прыцягвае многія напрамкі бізнесу, — заначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ. — І не толькі ў пастаўках неабходнай прадукцыі. Штогод тут з'яўляюцца новыя прадпрыемствы, ствараюцца рабочыя месцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Выбары-2015

# УЧАСТКОВЫЯ КАМІСІІ СФАРМІРАВАНЫ,

## ГРОШЫ З БЮДЖЭТУ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ — ПЕРАЛІЧАНЫ

**На ўчарашняй прэс-канферэнцыі старшыня Цэнтральнай камісіі па правядзенні выбараў і дзяржаўных рэферэндумаў Лідзія Ярмошына расказала пра ход кампаніі па выбарах Прэзідэнта нашай краіны.**

### НАЗІРАЛЬНІКІ ЎЖО ПРАЦУЮЦЬ

— У краіне акрэдытавана ўжо дзве доўгатэрміновыя міжнародныя назіральныя місіі — адна ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, другая — ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ). Пазаўчора атрымалі акрэдытацыйныя пасведчанні члены місіі АБСЕ на чале з яе кіраўніком спадаром Форам.

Па інфармацыі, агучанай Лідзіяй Ярмошынай, назіральнікі ад СНД — іх усяго 45 — прадстаўлены грамадзянамі нашай краіны (23), Расіі (15), Туркменістана (3), Казахстана (2), Кыргызстана і Таджыкістана — па адным назіральніку. У сваю чаргу БДІПЧ АБСЕ прадставіла спісы на 48 чалавек — гэта прадстаўнікі Арменіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Галандыі, Грэцыі, Даніі, Ірландыі, Кыргызстана, Літвы, Македоніі, Нарвегіі, Польшчы, Расіі, Сербіі, Злучаных Штатаў, Украіны, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі, Швецыі.

— Місія СНД даўно пачала маніторынг і замаўляе ў нас нейкія матэрыялы, прававыя эксперты місіі АБСЕ таксама ўжо прыйшлі ў Цэнтральную камісію і мы капіруем ім усе паступіўшыя да нас скаргі і адказы на іх, — паведаміла старшыня ЦВК.

Што да нацыянальных назіральнікаў, то іх акрэдытавана 624 чалавекі. З іх большасць — 494 назіральнікі — акрэдытавана ад грамадскіх аб'яднанняў, 72 чалавекі акрэдытаваны ад палітычных партый.

### ЖАНЧЫНЫ Ў БОЛЬШАСЦІ

— Пазаўчора скончыўся важны этап выбараў — фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій, — звярнула ўвагу журналістаў Лідзія Ярмошына. — У 6080 выбарчых камісій, утвораных па тэрыторыі Беларусі, было вылучана 76 791 чалавек. У склад камісій увайшоў 66 941 чалавек, іншымі словамі недзе на дзесяць тысяч прапанова перавышала попыт.

Як заўважыла Лідзія Ярмошына, у склад участковых выбарчых камісій увайшло амаль 48 тысяч жанчын — гэта больш за 70% ад усіх іх членаў. Калі казаць пра тэрытарыяльныя камісіі, то там было прыкладна 59% жанчын.

— Як бачым, участковыя камісіі прадстаўлены, у асноўным, жанчынамі, — канстатавала старшыня Цэнтрвыбаркама. — Павялічыўся працэнт па прадстаўніцтве маладых грамадзян ва ўзросце да 30 гадоў — 8,7%, або 5838 чалавек. Дзяржаўныя служачыя складаюць 2934 чалавекі, або 4,4%.

У выніку ў склад участковых камісій увайшлі: 37% прадстаўнікоў, вылучаных грамадзянамі праз падачу заяў, 14% вылучэнцаў ад працоўных калектываў, 48% — ад грамадскіх аб'яднанняў. У тым ліку гэта члены наступных палітычных партый: Беларуская аграрная партыя, Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), Беларуская сацыял-спартыўная партыя, Камуністычная партыя Беларусі, Аб'яднаная грамадзянская партыя, Партыя БНФ, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці.

### АД АЎСТРЫІ ДА ЯПОНІІ

— Прысвоены нумары 49 выбарчым участкам, утвораным за мяжой, — праінфармавала Лідзія Ярмошына. — Яны ўсе далучаны да тэрыторыі Ленінскага раёна Мінска — па месцы размяшчэння Міністэрства замежных спраў. У іх нумары з 77-га па 125-ы. Усе ўчасткі размешчаны па алфавіце, 77-м участкам з'яўляецца наша пасольства ў Аўстрыі, 125-м — участак пры пасольстве ў Японіі.

### ЧАСТКА ГРОШАЙ ПЕРАЛІЧАНА

Для правядзення выбараў Прэзідэнта з бюджэту пералічана 24% ад прадугледжанай на першы тур сумы — гэта 43 млрд рублёў, з якіх 39,6 млрд ужо накіраваны ў тэрытарыяльныя камісіі. Брэсцкая вобласць атрымала каля 6 млрд, Віцебская — столькі ж, Гомельская — каля 7 млрд, Гродзенская — больш за 4,6 млрд, Мінская — звыш 6,8 млрд, Магілёўская — звыш 5,3 млрд, горад Мінск — больш за 3,5 млрд.

— Дадзеныя сродкі пералічаны для матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння тэрытарыяльных участковых камісій, аплаты камандзіровачных і іншых выдаткаў, — а таксама 50% выдаткаў — на заработную плату тэрытарыяльных камісій, — патлумачыла Лідзія Ярмошына.

Пры гэтым кіраўнік ЦВК адзначыла, што самыя нізкія выдаткі на правядзенне выбараў будуць у Мінску, нягледзячы на тое, што гэта вялікі рэгіён.

— У Мінску працуе толькі каля 670 участковых камісій і 10 тэрытарыяльных (Мінская гарадская і 9 раённых), — нагадала яна. — Такім чынам, у Мінску няма камандзіровачных, таму гэтая катэгорыя выдаткаў выключана. Так што нягледзячы на самую вялікую колькасць выбаршчыкаў, у Мінску выбары абыходзяцца танней, чым у рэгіёнах.

Для 49 участковых камісій, утвораных за межамі Беларусі, грашовыя сродкі ў памеры больш за 72 млн рублёў пералічаны Міністэрствам замежных спраў. У асноўным яны пакрываюць транспартныя і паштовыя выдаткі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ Запрашальнік

# «АЛІМПІЯ» — «ПЕРАЗАГРУЗКА»: ЗРАБІ СВОЙ ВЫБАР!

**28-30 жніўня Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы міністэрстваў спорту і турызму, адукацыі, інфармацыі, Беларускай чыгункі, Мінскага абласнога выканаўчага камітэта праводзіць рэспубліканскі спартыўны фестываль працоўнай моладзі «Алімпія». Палатачны гарадок размесціцца на беразе жывапіснай ракі Свіслач каля пасёлка Ракаў у Валожынскім раёне.**

У Год моладзі і выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (адсюль і слоган форуму «Наш год — наш выбар») актыўная і ініцыятыўная моладзь збярэцца на «Алімпію», каб «зверыць гадзіннікі» і аб'яднаць намаганні. У сувязі з гэтым арганізатары традыцыйнага праекта зрабілі своеасаблівую «перазагрузку» і сёлета фестываль набыў новы статус — спартыўна-адукацыйнага форуму. Яго галоўная мэта — аб'яднанне і навучанне хлопцаў і дзяўчат праз трэнінгавыя і лідарскія праграмы, правядзенне майстар-класаў, прэзентацый, сустрэч з вядомымі людзьмі. Адной з асноўных пляцовак для гэтага стане пляцоўка адкрытых дэбатаў «Выбірай.by», падчас якіх маладыя людзі ў форме дыскусій падзеляцца праблемамі, якія хвалююць пакаленне next, і разам з экспертамі знойдуць магчымыя шляхі іх вырашэння.

Таксама будзе працаваць пляцоўка «Я патрыёт», на якой размесціцца міні-выстава вагона-музея «Маладзёжнага агітпоезда «Кветкі Вялікай Перамогі». На ёй жа з удзелам брэсцкага ваенна-гістарычнага клуба «Гарнізон» запланавана арганізаваць міні-рэканструкцыі ваенных эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны. На пляцоўцы «Я лідар. Я прафесіянал» пройдуць сустрэчы «алімпійцаў» з медыяперсонамі, вядомымі бізнесменамі, аўтарамі найбуйнейшых айчынных інфармацыйных інтэрнэт-парталаў, якія падзеляцца з удзельнікамі форуму гісторыяй свайго поспеху, распавядуць пра выніковасць працы ў камандзе. Будучых чэмпіёнаў-аматараў па пад'ёме гіры, армрэслінгу, дартсе, бадмінтоне, настольным тэнісе і футболе аб'яднае пляцоўка «Беларусь спартыўная». А на «Беларусі творчай» запланаваны майстар-класы па вакале, ігры на гітары, сучасных танцах, якія правядуць папулярныя дзеячы мастацтваў. Тут жа суботнім вечарам выступяць папулярныя айчынныя маладзёжныя групы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

■ Святкуй, сталіца!

# ГІСТАРЫЧНЫЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ, КАНЦЭРТЫ І ПАЎМАРАФОН

## У Дзень горада пройдзе больш за 60 святочных мерапрыемстваў

**Падрыхтоўка да іх даўно ўжо ідзе поўным ходам. Да ўрачыстасці гарадское кіраўніцтва і грамадскія арганізацыі запланавалі шэраг забаўляльных, спартыўных і сацыяльных імпрэз — не прапусціце самыя цікавыя!**

Сёлета дзень нараджэння сталіцы пройдзе пад дэвізам: «Мой родны Мінск, ты сэрца Беларусі!». Мерапрыемствы пачнуцца ўжо 11 верасня, старт святу ў гэты дзень дасць традыцыйнае падвядзенне вынікаў гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар». Падчас яго сапраўдным спецыялістам у сваёй справе ўручаць узнагароды «Найлепшы па прафесіі». Урачыстасць і святочны канцэрт адбудуцца ў Палацы культуры прафсаюзаў.

Асноўныя ж мерапрыемствы чакаюць жыхароў і гасцей сталіцы ў суботу 12 верасня. Сапраўдным відовішчам абяцае стаць традыцыйнае ўжо шоу, якое цяпер будзе праводзіцца раз на два гады, — міжнародны фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». У ім возьмуць удзел прадстаўнікі клубаў ваеннай рэканструкцыі з 6 краін.

На вялікай зялёнай пляцоўцы на скрыжаванні праспектаў Машэрава і Пераможцаў за гэты дзень зменіцца некалькі эпох: Сярэднявечча, вайна з Напалеонам, Першая і Другая сусветныя войны... Гледачоў чакаюць рэканструкцыі вялікіх баталій, рыцарскія турніры і конныя паядынкі. Апроч баявых дзеянняў, тут разгорнецца «горад майстроў» з магчымасцю вырабіць сувеніры самастойна. Пачатак фестывалю ў 11.30.

Асноўнай пляцоўкай святкавання стане плошча ля Палаца спорту. Яна распачне працу таксама ў 11.30. Тут адбудзецца канцэртная праграма «Зоркі сталіцы» з удзелам беларускіх эстрадных выканаўцаў, таксама арганізатары плануюць запрасіць выканаўцаў з Расіі. Музыка ля Палаца спорту будзе гучаць да 22 гадзін, не адрываючыся ад канцэрта, можна будзе і падсілкавацца — недалёка ад сцэны прадугледжана работа аб'ектаў харчавання і гандлю.

У межах праграмы адкрыецца Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Як паведаміў Сяргей Мядзведзеў, ужо ёсць дамоўленасць з калектывамі з Расіі. У прыватнасці, выступяць артысты Смаленскага тэатра музкамедыі, дзіцячыя калектывы са Смаленска.



Для прыхільнікаў духоўнага адпачынку каля храма-помніка ў гонар Усіх Святых а 15-й гадзіне пачнецца гала-канцэрт агульнарэспубліканскай акцыі «Харавое веча». У ім возьмуць удзел больш за тры тысячы ўдзельнікаў харавых калектываў з усіх рэгіёнаў краіны. Апроч канцэрта, пройдзе акцыя «Малітва за Беларусь».

Як заўсёды, цікавай абяцае быць праграма ў Верхнім горадзе. У аднайменнай канцэртнай зале з 12 да 17 гадзін адбудуцца ўрачыстыя цырымоніі заключэння шлюбу 9 пар з кожнага раёна сталіцы. Маладыя атрымаюць сертыфікаты, падпісаныя старшынёй Мінгарвыканкама.

Яшчэ адно ўшанаванне ў гэты дзень пройдзе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета, а 18 гадзіне тут будуць уручаць узнагароды «Мінчанін года».

Праца святочных пляцовак прадугледжана не толькі ў цэнтры, а і ва ўсіх раёнах Мінска. Усяго да Дня горада запланавана больш за 60 мерапрыемстваў. Завершыцца свята ў 22 гадзіны каля стэлы «Мінск — горад-герой» феерверкам, які працягнецца 12 хвілін. «Яго вышыня 400 метраў, выкарыстоўваюцца камп'ютарнае кіраванне і найноўшыя тэхналогіі. Усіх запрашаем!» — падсумаваў намеснік начальніка ўпраўлення, начальнік аддзела ўстаноў культуры і культурна-асветніцкай работы Мінгарвыканкама Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.

Як паведаміў **першы намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Андрэй ПАЦЕЕЎ**, прымеркаваныя да свята спартыўныя мерапрыемствы будуць праходзіць з 10 па 13 верасня. Але адно з іх, Першы міжнародны турнір па боксе памяці ганаровага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера Беларусі У. Бацвінніка, адбудзецца на «Чыжоўка-Арэне» яшчэ раней — з 2 па 6 верасня.

12 верасня на Камсамольскім возеры пройдуць гарадскія спаборніцтвы па веславанні на байдарках і каноэ. У гэты ж дзень на пляцоўцы каля Палаца спорту можна будзе ўбачыць міжнародны турнір па сілавым экстрыме.

Галоўнай спартыўнай падзеяй стане Мінскі паўмарафон, які пачнецца 13 верасня ў 11.00. Яго дыстанцыя складзе 21 км 97 м, а маршрут пройдзе па праспектах Пераможцаў і Незалежнасці, вуліцы Карла Маркса. Заяўкі на ўдзел прымаюцца да 9 верасня, удзельнічаць могуць усе ахвотныя ад 18 гадоў. У межах мерапрыемства пройдзе карпаратыўны забег з дыстанцыяй 5 км, а таксама легкаатлетычны прабег на 10 км 550 м. А для самых маленькіх бегуноў 4 — 6 гадоў адбудзецца забег на 50 метраў.

«У межах святкавання Дня горада пройдзе фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі», — дадала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА.**

Фестываль пройдзе па трох намінацыях: выканаўчае мастацтва, мастацкая творчасць, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Імпрэза адбудзецца 13 верасня ў Верхнім горадзе, пачатак у 14.00. Удзельнікаў і гледачоў на інвалідных калясках даставяць на фестываль сацыяльнае таксі.

Апроч гэтага, 12 верасня пройдзе гарадская акцыя «Прывітанне, мінчанін!». Падчас яе ў радзільнях будуць віншаваць мам, якія ў гэты дзень народзяць дзяцей. А ў раённых цэнтрах сацабслугоўвання пройдуць выставы фотаработ, прыкладной творчасці, музычныя вечары.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

■ Фестываль

# ВІНІЛ, РЭГІ І НЕФАРМАТ

**Сёння, 28 жніўня, на культурнай пляцоўцы сталіцы Studio 67 пачынаецца фестываль кіно і музыкі «Белае люстэрка», што ўпершыню адбыўся ў 2013 годзе. На гэты раз арганізатары збіраюцца здзіўляць гледачоў падарожжам на Месяц, ямайскай музыкай і андэграўнднымі творамі Мікалая Капейкіна.**

Назва фестываля асацыюецца з кінаэкранам, героі якога, быццам з люстэрка, выходзяць на сцэну. Музыка і кіно тут канцэптуальна звязаныя — усе фільмы фестывалю пра музыкаў ці імі зробленыя. Сёння, напрыклад, Дзень вінілу з вінілавым марафонам ад вядомых дыджэяў, прэм'ерай стужкі «Наш вініл важыць тону» і паказам легендарнага фантастычнага фільма Жоржа Мельеса «Падарожжа на Месяц» 1902 года, які будзе агучваць тапёрамі — калектывам «Мроі Пафнуцыя». У праграме заўтрашняга дня, які будзе адзначаны жанрам рэгі і яго субжанрам рутс, — выступ легендарнага ямайца Лі Скрэтч Пэры і паказ фільма «Бачанне раю». 30 жніўня — Дзень НАМ (Нефармальнага аб'яднання моладзі), у гонар музычнага гурта. У гэту нядзелю можна будзе пачуць сам гурт і ўбачыць стужку «Зорны ворс».

«Любы фестываль — гэта яскравы вопыт, забаўляльны і адукацыйны адначасова», — кажа прэс-сакратар фестывалю Дзяніс Клявіцкі.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**


**Гродненский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ
в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Гроднооблпотребобщества, назначенного на 03.09.2015 г., следующего содержания: аукцион состоится 14.09.2015 г. в 14.00, последний день приема заявлений – 09.09.2015 г. до 15.00.

УНП 590959404


# ЛІГА ДЛЯ ЧЭМПІЁНА

## БАТЭ ў пяты раз прабіўся ў групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў

**Барысаўскі футбольны клуб для нашага спорту робіць фантастычныя рэчы. Камандзе, якая выступае ў далёка не самым моцным чэмпіянаце, удаецца кожны год прабівацца ў самы топавы клубны турнір Старога Свету. БАТЭ нават нехта крытыкуе, але ён, нягледзячы на гэта, дамагаецца станоўчага выніку і ў чарговы раз прывязе ў Беларусь наймацнейшыя клубы Еўропы. Што ні кажы, а гэта клас.**

Сербскі «Партызан», што трапіў на барысаўчан у плэй-оф, аказаўся самым моцным сапернікам у кваліфікацыі, з якім беларусы сустракаліся за апошнія гады. Пры гэтым клуб з Бялграда аказаўся нашым футбалістам па сілах. Гэта было відаць і ў першым паядынку, калі падапечныя Аляксандра Ермаковіча перамаглі з лікам 1:0, і ў другой сустрэчы, першы тайм якой быў за «жоўта-блакітнымі». І гэта нягледзячы на тыя абяцанні футбалістаў «Партызана» аб тым, што іх балельшчыкі зладзяць для беларусаў сапраўднае пекла на родным стадыёне. Але языкамі галы не забіваюць. І часам іх проста лепш трымаць за зубамі, каб пасля не быць смешным. А балельшчыкі, футбалісты «Партызана», дарэчы, яшчэ да пачатку першай гульні былі ўпэўнены ў сваёй выніковай перамозе.

Іх пыл на родным бялградскім стадыёне на 25-й хвіліне трапным ударам астудзіў Ігар Стасевіч. На жаль, напрыканцы сустрэчы беларусы крыху здалі, што дазволіла гаспадарам адыграцца і нават забіць пераможны мяч. Аднак гэта ўсё роўна не дазволіла сербам прайсці ў Лігу чэмпіёнаў. Далей ідзе БАТЭ!

— Сёння нам патрэбны быў вынік, — адзначыў на прэс-канферэнцыі **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ.** — Не так істотна, што мы саступілі. Важна, што мы трапілі ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў. Наша памкненне, наша жаданне дапамагло дасягнуць запаветнай мэты.



Прапануем вашай увазе астатнія вынікі матчаў плэй-оф Лігі чэмпіёнаў: **«Дынама»** (Харватыя) — «Шкендэрбеу» (Албанія) — 4:1 (2:1), **«Мальмё» (Швецыя)** — «Сэлцік» (Шатландыя) — 2:0 (2:3), **«Макабі» (Тэль-Авіў)** — «Базэль» (Швейцарыя) — 1:1 (2:2), **«Шахцёр» (Украіна)** — «Рапід» (Аўстрыя) — 2:2 (1:0), **«Манака» (Францыя)** — «Валенсія» (Іспанія) — 2:1 (1:3), **АПАЭЛ (Кіпр)** — «Астана» (Казахстан) — 1:1 (0:1), **«Баер» (Германія)** — «Лацыё» (Італія) — 3:0 (0:1), **«Бруге» (Бельгія)** — «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — 0:4 (1:3), **ЦСКА (Расія)** — «Спортынг» (Партугалія) — 3:1 (1:2).

У выніку лёсавання, якое адбылося ўчора вечарам у Манака, барысаўскі БАТЭ трапіў у групу **«Е»** і згуляе з іспанскай **«Барселонай»**, нямецкім **«Баерам»** і італьянскай **«Ромай»**.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

■ Бацькам на заметку

# У 10 ГАДОЎ ВЫХОЎВАЦЬ ПОЗНА

## Гіперактыўных вучняў трэба не караць, а падтрымліваць

**Свавольнік і гарэза, які не слухаецца настаўнікаў і прыносіць клопаты і турботы ўсяму класу... Магчыма, ён робіць гэта не спецыяльна, а таму, што мае незаўважаны дыягназ — гіперкінетычнае расстройства ўвагі і паводзін. Дарэчы, менавіта з такіх непаседаў пры дапамозе бацькоў і спецыялістаў часта вырастаюць выдатнікі вучобы і таленавітыя людзі.**



Прыкметы захворвання досыць простыя. Дзіця не можа доўга знаходзіцца на адным месцы, яно ўвесь час у руху, абсалютна нічога не баіцца і не засяроджвае ўвагу на чымсьці адным працяглы час. Пакаранне тут не дапаможа — патрэбны заахвочванне, падтрымка і, зразумела, лячэнне.

Самае галоўнае пры гэтым — час. Да сямі гадоў гіперкінетычнае расстройства ўвагі і паводзін лёгка карэкціруецца, да 10 гадоў можна ўжо толькі змяніць звычкі ў паводзінах і адносінах да школы, а вось пасля 10 практычна немагчыма нічога зрабіць — дзіцяці будзе патрэбна дапамога псіхіятра.

*— Калі псіхіятр, псіхатэрапеўт ці неўролаг ставяць дыягназ «гіперкінетычнае расстройства ўвагі і паводзін», дзіцяці лепш ісці ў школу з сямі гадоў і сядзець на першай парце побач з настаўнікам, які будзе разумець яго стан,* — **расказала <u>Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ, загадчыца лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця».</u>** — *Кожны ўрок неабходна звяртацца да такога вучня асабіста, падтрымліваць яго словамі. Ад таго, ці зможа першы настаўнік наладзіць патрэбны кантакт, залежыць далейшая вучоба дзіцяці ў школе і якасць яго жыцця ўвогуле. Вельмі карысна стымуляваць дзіця, напрыклад, налічваць балы за добрае выкананне заданняў і пасля дасягнення пэўнай іх колькасці адвесці яго туды, куды яму вельмі хочацца.*

Псіхічна-нервовае здароўе немаўляці непасрэдна залежыць ад стану маці. Даследаванні цэнтра паказваюць, што дзеці жанчын, якія мелі пэўныя праблемы падчас цяжарнасці і родаў, пакутуюць ад энцэфалапатыі. Хвароба гэтая лечыцца, і, як правіла, калі немаўляці спаўняецца месяц, яно ўжо практычна здаровае.

Аднак тая ж статыстыка паказвае, што ва ўзросце 5-6 гадоў каля 40% такіх дзетак хварэюць на гіперкінетычнае расстройства ўвагі і паводзін, больш за 17% маюць парушэнні развіцця мовы, а больш як 9% пацыентаў пастаўлены дыягназ энурэз.

*— Амаль 70% дзетак, якія лячыліся ад энцэфалапатыі нованароджаных, маюць памежны нервова-псіхічны стан. І гэта даволі вялікі паказчык, — заўважыла спецыяліст. — Мы рэкамендуем такім дзецям ісці ў школу пазней (не раней за 7 гадоў), бо расстройства ўвагі адступае па меры развіцця нервовай сістэмы, якая канчаткова фарміруецца ў 11 гадоў. Пры сумеснай дапамозе настаўнікаў, бацькоў і медыкаментаў хвароба сыходзіць. Калі пакінуць дзіця без увагі, то можа адбыцца расстройства асобы, узнікне залежнасць ад псіхаактыўных рэчываў: спіртнога, цыгарэт і спайсу.*

Клопат бацькоў пры гэтым — самы важны сродак дапамогі. Яны павінны своечасова заўважыць асаблівасці паводзін і звярнуцца да спецыяліста. Калі ж запыт на даследаванне стану гіперактыўнага дзіцяці дасылае школа, якая сведчыць, што яно настолькі не здольнае вучыцца, што патрабуецца перавод у іншы клас — пераломваць сітуацыю ўжо позна.

**Ірына СІДАРОК** ■

# ШЧАСЦЕ Ў КУБЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Пасля таго, як Алену Шмурадко з дзецьмі выпішуць з бальніцы, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Светлагорскага раёна прадаставіць гэтай сям'і няню і выдасць пасведчанне шматдзетнай сям'і, што дазволіць вырашыць жыллёвае пытанне за кошт ільготнага крэдыту.

**Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Таццяна КУЛЕШ** расказвае, што, дзякуючы Указу Прэзідэнта №41, сям'я будзе мець права на бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання без уліку прыбыткаў:

— Бацькам таксама будзе выплачана аднаразовая дапамога пры нараджэнні — 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму на першае дзіця і па 14 бюджэтаў на другое і трэцяе — усяго Br56 млн. Дапамога па доглядзе дзяцей да ўзросце да 3 гадоў са жніўня складзе Br7701,8 тысячы. Аднаразовая выплата пры нараджэнні двух і больш дзяцей — Br8849,2 тысячы. І на працягу паўгоддзя сям'я Шмурадко мае права звярнуцца па сямейны капітал — гэта $10 тысяч безнаяўных.

З пачатку года на Гомельшчыне трэцяе і наступнае дзіця нарадзілася ў 1240 сем'ях. Яны і могуць скарыстацца падарункам дзяржавы ў выглядзе сямейнага капіталу. Цяпер пададзена амаль 1100 заяў і вынесена амаль 900 рашэнняў аб яго прызначэнні.

У вобласці пражывае больш за 12,3 тысячы шматдзетных сем'яў. Галоўным чынам гэта сем'і з трыма — 79% і чатырма дзецьмі — 14%. З кожным годам іх колькасць павялічваецца ў сярэднім на 10-12%.

Значная падтрымка аказваецца малазабяспечаным сем'ям. У першым паўгоддзі гэтага года дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога прадастаўлена на суму Br13,8 млрд. Яе атрымалі 2,8 тысячы сем'яў, 68% з іх маюць дзяцей.

Напрыклад, гамяльчанцы Наталлі Калінінай, якая ў студзені атрымала сацыяльнае жыллё і знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, за кошт дзяржаўнай дапамогі дапамаглі набыць неабходныя халадзільнік, газавую пліту, канапу. Жанчына з'яўляецца сіратой і апёку над ёй узялі супрацоўнікі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Навабеліцкага раёна.



Фота БЕЛТА.

Штогод у вобласці праводзяцца разнастайныя акцыі, у тым ліку «Збяры партфель да школы». Дабрачынныя, прафсаюзныя арганізацыі, грамадскія аб'яднанні, установы адукацыі з прыцягненнем спонсарскіх сродкаў дапамагаюць набыць усё, што неабходна для школы, дзецям з малазабяспечаных сем'яў.

Вельмі важным для шматдзетных сем'яў з'яўляецца рашэнне жыллёвых пытанняў. Ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля ім выдаецца на 40 гадоў пад 1% гадавых. Адначасова вылучаецца фінансавая дапамога дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па выдадзеных крэдытах. Пры нараджэнні трэцяга дзіцяці ў сям'і дзяржава гасіць 75% льготнага крэдыту на будаўніцтва жылля, пры нараджэнні чацвёртага і наступных — усе 100%.

На Гомельшчыне летась 961 шматдзетная сям'я палепшыла свае жыллёвыя ўмовы за кошт такіх крэдытаў, 28 сем'яў атрымалі сацыяльнае жыллё. Плануецца, што сёлета будзе ўведзена ў эксплуатацыю 700 кватэр для шматдзетных сем'яў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# ВЫНІКОВАЕ ЛЕТА

**Два медалі (сярэбраны і бронзавы) заваявалі беларускія школьнікі на 12-й Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе, якая праходзіла сёлета ў Цвярской вобласці ў Расіі. У ёй прынялі ўдзел 164 канкурсанты з Аўстраліі, Аргенціны, Бельгіі, Бразіліі, Вялікабрытаніі, Даніі, Інданезіі, Казахстана, Кітая, Японіі, Нідэрландаў, Новай Зеландыі, Польшчы, Расіі, ЗША, Тайланда, Турцыі, Філіпін, Фінляндыі — усяго з 40 краін.**

Міжнародная геаграфічная алімпіяда (IGeo) праводзіцца, пачынаючы з 1996 года. Да 2012-га яна арганізоўвалася раз на два гады, а потым стала штогадовай. Да ўдзелу у ёй дапускаюцца навучэнцы ва ўзросце ад 16 да 19 гадоў. Мова правядзення — англійская, таму, акрамя ведання геаграфіі, удзельнікам трэба яшчэ і свабодна валодаць англійскай мовай. Алімпіяда складаецца з трох асноўных тураў — тэарэтычнага, які ўяўляе з сябе пісьмовы тэст, палявога і мультымедыйнага (мультымедыйнага тэста).

Адной з самых важных тэм сёлета стала змена клімату, а самым напружаным выпрабаваннем — палявы тур, падчас якога удзельнікам трэба было прадэманстраваць свае веды ў практычнай геаграфіі. Праграма ўключала таксама і стэндавыя даклады ад каманд.

Беларусь на алімпіядзе прадстаўлялі Міхаіл Стрэмаус, навучэнец 10 класа сярэдняй школы № 18 г. Баранавічаў, Уладзіслаў Дагліс, адзінаццацікласнік гімназіі № 1 г. Жодзіна, Аляксандра Цяцёркіна, адзінаццацікласніца гімназіі № 2 г. Віцебска і Арцём Зубрыцкі, дзесяцікласнік сталічнай гімназіі № 22.

Па выніках спаборніцтваў Арцём Зубрыцкі заваяваў «серабро», а Міхаіл Стрэмаус узнагароджаны бронзавым медалём. Усяго на алімпіядзе было разыграна 13 залатых, 26 сярэбраных і 39 бронзавых медалёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by* ■


**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах дер. Батуринка, дер. Скураты, дер. Малое Залужье Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **29 сентября 2015 года, в 11.00,** аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1486 га, № 624883001101000140, дер. Батуринка (по генплану № 6 квар. 2)<br>Лот № 2 — площадь 0,1384 га, № 624883009101000200, дер. Скураты (по генплану № 6)<br>Лот № 3 — площадь 0,1500 га, № 624883006601000118, дер. Малое Залужье (по генплану № 11)<br>Лот № 4 — площадь 0,1500 га, № 624883006601000119, дер. Малое Залужье (по генплану № 14) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 250 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 120 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 80 000 000 рублей<br>Лот № 4 — 80 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно поживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Батуринка — подъездная дорога,<br>дер. Скураты — электричество,<br>дер. Малое Залужье — нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 23 сентября 2015 года в 17.00 |
| 15 | **Контактный телефон** | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

<u>Примечания:</u> для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,**
**опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16, строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт г. Минск:**

«...Стоимость 1 кв.м квартир общей площадью **117,4** кв.м на 19 этаже составляет **1000** (одна тысяча) **долларов США** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 пн–пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00).**

УНП 101019973



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар»,**
**опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартиры площадью **40,68 кв.м** на 18 этаже – 1300 (одна тысяча триста) долларов США, площадью **65,11 кв.м** на 18 этаже – 1350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1332441 **считать недействительным.**

УНП 100122726

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - Капитальное строение инв. № 400/С-60256 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание) площадью 656,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 13;<br>- асфальтобетонное покрытие площадью 147 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 13;<br>- покрытие из цементной плитки площадью 49 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 13. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000001000605, площадь 0,0437 га (назначение – размещение административных зданий), адрес: г. Гродно, ул. Пучкова, 13 |
| **Начальная цена продажи** | 5 412 720 000 (пять миллиардов четыреста двенадцать миллионов семьсот двадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 541 272 000 (пятьсот сорок один миллион двести семьдесят две тысячи) белорусских рублей |
| **Продавец** | Филиал «Грузовой автомобильный парк № 2 г. Гродно», 230001, г. Гродно, ул. Пучкова, 28, 52-42-20 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5% от конечной цены продажи имущества |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012620312017 в ОАО «Приорбанк», г. Гродно, БИК 153001749, УНП 500836025. Получатель – Филиал «Грузовой автомобильный парк № 2 г. Гродно», 230001, г. Гродно, ул. Пучкова, 28 |

**Аукцион состоится 24 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.05.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 18 сентября 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**



***К сведению акционеров ОАО «Современные розничные технологии»***

**08 сентября 2015 года в 12.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Берестянская, 17, 13 этаж**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Современные розничные технологии»**

**Форма проведения собрания – очная.**

**Регистрация участников с 11.30 до 11.55.**

**Для регистрации на собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении Порядка и условий выделения из ОАО «Современные розничные технологии» новых юридических лиц.
2. Об утверждении разделительного баланса ОАО «Современные розничные технологии».
3. Об утверждении изменений в Устав ОАО «Современные розничные технологии».

Орган, созывающий собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «Современные розничные технологии», основание созыва: решение от 26.08.2015 (протокол № 13).

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться с 01.09.2015 по адресу: г. Минск, ул. Берестянская, 17, 13 этаж по рабочим дням с 14.00 до 16.00, а также в день проведения общего собрания акционеров по месту проведения собрания с 11.30 до 11.55. УНП 690019195


■ Непрыдуманая гісторыя

# Выратавальніца Рут

## ЧАМУ АМЕРЫКАНКА ПАХАВАНА НА ВАЙСКОВЫХ МОГІЛКАХ?

**Пасля вызвалення Мінска чатырнаццацігадовая Тома Місейчык разам з мамай і братам жыла ў падвальным памяшканні ў раёне Нямігі. На траіх яны мелі адзін пакой, але і гэта лічылася выгодамі, калі навокал былі руіны... Праўда, ад перанесеных ваенных цяжкасцей, а таксама ад таго, што Свіслач часта выходзіла з берагоў і затапляла пакой, Тома цяжка захварэла. Настолькі, што ў хуткім часе не змагла хадзіць. Маці дзяўчынкі ў роспачы кінулася шукаць дапамогу, і знайшла яе...**



Тамара Місейчык у дзяцінстве і цяпер.

### «НАЙБОЛЬШ МАМА ЗАПОМНІЛА ШАКАЛАДНЫ НАПОЙ»

У тыя часы дзеці знаходзілі сабе забавы ў гульнях на руінах — там можна было адшукаць шмат цікавага. У невымернае захапленне пасляваенную малечу прыводзіў паказ трафейных фільмаў. Малыя «штурмавалі» кінатэатр, хаваліся, каб паглядзець кіно бясплатна, хоць стоячы. Тады часта паказвалі фільмы пра Тарзана, «Багдадскі злодзей», «Зора», «Жалезная маска», музычныя стужкі... А яшчэ цікава было разглядаць «элітарныя» крамы, у якіх было шмат розных прадуктаў, але звычайныя людзі не маглі іх набыць: харчы па нейкай таямнічай сістэме размяркоўваліся паміж чыноўнікамі, партыйнымі работнікамі і вайскоўцамі.



Місія ЮНРРА. У цэнтры ўсміхаецца Рут Уолер.

Але адкуль у галоднай пасляваеннай краіне на прылаўках з'явіліся кансервы, сыры, рыба, ікра, шакалад, арахісавае масла? Справа ў тым, што 9 лістапада 1943 года ў Вашынгтоне прадстаўнікі 44 дзяржаў — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі падпісалі дамову аб стварэнні ЮНРРА (UNRRA — United Nations Relief and Rehabilitation Administration) — Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення аб'яднаных нацый. Гэта была першая буйная міжнародная гуманітарная арганізацыя ў вызваленым ад фашызму свеце. У задачы ЮНРРА ўваходзіла аказанне пасляваеннай эканамічнай дапамогі краінам Еўропы, рэпатрыяцыя і дапамога бежанцам. Пагадненне аб пастаўках дапамогі ў Беларусь на суму 61 млн долараў ЗША было падпісана ў Вашынгтоне ў снежні 1945 года.

Доўгія гады ў Беларусі дзейнасць гэтай арганізацыі замоўчвалася, паколькі ў студзені 1946-га была прынята пастанова, у адпаведнасці з якой забаранялася «адказным партыйным савецкім работнікам у сваіх дакладах і гутарках прыводзіць якія-небудзь лічбы па пастаўках ЮНРРА і спасылацца на пытанні дапамогі з боку ЮНРРА». Але людзі старэйшага пакалення добра памятаюць амерыканскія пасылкі з ежай, адзеннем і лекамі. Толькі прадуктаў харчавання па лініі ЮНРРА было завезена звыш 100 тысяч тон.

**Плыт разваліўся ў вадзе, і дзеці пачалі тануць. Нядоўга думаючы, Рут кінулася ў сажалку і павыцягвала іх.**

Апроч рэчавай дапамогі, арганізоўвалася і лячэнне хворых. Менавіта дзякуючы місіі ЮНРРА атрымалася адправіць Тому Місейчык у санаторый у Астрашыцкім гарадку.

— Мама расказвала, што есці там ніколі не хацелася, харчоў было шмат і ўсё было вельмі смачнае. Найбольш яна запомніла шакаладны напой, кампот з сухафруктаў, што для ваенных дзяцей было рэдкасцю, — успамінае сёння дачка Тамары Таццяна Грачанікава.





Магіла Рут Уолер на Вайсковых могілках у Мінску.

### «КАБ НЕ БЫЛО ДАПАМОГІ, МЯНЕ ТАКСАМА НЕ БЫЛО Б»

Для таго, каб урэгуляваць размеркаванне гуманітарных паставак, 1 красавіка 1946 года ў Беларусь прыехала кіраўніцтва ЮНРРА. Размясцілі яго ў сядзібе ў Лошыцкім парку. Такім чынам і 24-гадовая ўраджэнка Каліфорніі Рут Уолер, якая была жонкай намесніка кіраўніка, а пасля кіраўніка місіі Тэадора Уолера, трапіла ў Мінск. Жанчына займала ў арганізацыі пост сакратара і вяла ўсё яе справаводства. Удзень разам з астатнімі членамі місіі Рут ездзіла па краіне і дапамагала размяркоўваць прадукты і іншую дапамогу, а ўвечары гуляла ў баскетбол, тэніс, бавіла час ля сажалкі ў парку.

У адзін з такіх дзён напрыканцы ліпеня, калі сакратар місіі адпачывала на беразе, яна ўбачыла ў возеры трох падлеткаў, якія выправіліся ў плаванне на плыце. Аднак плыт разваліўся ў вадзе, і дзеці пачалі тануць. Нядоўга думаючы, Рут кінулася ў сажалку і павыцягвала іх. На наступны дзень яна, як звычайна, паехала на працу, але там у яе раптоўна паднялася тэмпература. Беларускія лекары ратавалі амерыканку некалькі дзён, але на той час яны не мелі ў сваім арсенале пеніцыліну. Па злой іроніі лёсу маладая амерыканка Рут Уолер памерла ў Мінску 4 жніўня 1946 года ад хуткацечнага менінгіту і запалення лёгкіх, у той час як дзякуючы дапамозе ЮНРРА ў 1947 годзе тут быў пабудаваны пеніцылінавы завод (цяпер «Белмедпрэпараты»). Да свайго 25-годдзя яна не дажыла 15 дзён...

**Толькі прадуктаў харчавання па лініі ЮНРРА было завезена звыш 100 тысяч тон.**

Знайсці магілу Рут Уолер на Вайсковых могілках у Мінску вельмі проста. Яна месціцца за дзясятак метраў ад царквы Аляксандра Неўскага на цэнтральнай алеі і нічым не вылучаецца сярод астатніх. Хіба што помнік на ёй не зусім звыклы для беларускіх магілак: надпіс на ім выкананы на рускай і англійскай мовах. Кожны год прадстаўнікі амерыканскага пасольства і тыя, хто ведае пра місію ЮНРРА ў Беларусі, прыходзяць на магілу Рут у дзень яе смерці, каб ушанаваць памяць жанчыны.

Таццяна Грачанікава ўпершыню даведалася пра амерыканку, пахаваную на Вайсковых могілках, у 70-я гады. Яе бабуля вадзіла сюды дачку Тамару і казала, што тут пахавана яе выратавальніца.

— Мама бачыла розных жанчын, якія яе наведвалі і ўладкоўвалі ў санаторый у Астрашыцкім гарадку, але не памятае, хто яны. У любым выпадку яе выратавала дапамога ЮНРРА, у якой менавіта Рут займалася справаводствам. Каб не было гэтай дапамогі, дык не было б і гэтых дзіцячых дамоў, бальніц, школьнага харчавання, санаторыяў. І мяне таксама не было б, — гаворыць Таццяна Грачанікава.

Невядома, ці мае дачыненне да гэтай гісторыі Рут Уолер асабіста, але Тамара Фёдараўна, якая ўжо ў паважаным узросце, і дасюль успамінае амерыканку добрым словам.



Таццяна Грачанікава штогод наведвае магілу выратавальніцы маці.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК. Фота аўтара.**
*seradzyuk@zviazda.by*

■ Спецыяльны рэпартаж

# БЯСПЕЧНЫ ВАКЗАЛ

**Калі Нацыянальны аэрапорт называюць паветранымі варотамі краіны, сталічны чыгуначны вакзал здаўна лічыцца наземнай брамай не толькі Мінска, але і ўсёй Беларусі. Кожны дзень тут чакаюць цягнікоў, працуюць ці проста адпачываюць тысячы мінчан і гасцей горада. Аднак далёка не кожны спяшаецца на электрычку ці заскочыў перакусіць у адну з кавярняў. Хапае і тых, хто толькі і чакае спрыяльнай магчымасці, каб завалодаць чужой маёмасцю...**

## ВАС ЗДЫМАЮЦЬ!

— Вакзал станцыі «Мінск-Пасажырскі» — самы буйны ў нашай краіне, — кажа Генадзь ЗАВАЦКІ *(на фота)*, намеснік начальніка Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі, з якім мы сустрэліся ў памяшканні аператыўна-дзяжурнай службы на чыгуначным вакзале. — Гэтаму аб'екту міліцыя заўжды аказвае пільную ўвагу. У тым ліку і ў плане грамадскай бяспекі.



Калі ў аэрапорце «Мінск-2» ты часцяком сустракаеш заможную публіку, на вакзале маеш справу з прадстаўнікамі ўсіх сацыяльных слаёў.

— Трэба мець на ўвазе, што злачынцы таксама карыстаюцца транспартам, — заўважае Генадзь Завацкі. — І нехта прыходзіць на вакзал як на працу, каб здзейсніць крадзеж. Ёсць і тыя, хто хоча проста павесяліцца ў кавярні, а іншыя будуць шукаць у міліцыянера даведачную інфармацыю. Менавіта таму супрацоўнік патрульна-паставой службы мусіць быць настолькі шматгранным, каб умець разабрацца з любой праблемай, з якой сутыкнецца падчас працы.

Для чыгуначнага вакзала і ў цэлым для Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце, які абслугоўвае таксама ўчастак чыгункі ў межах Мінскай вобласці, асноўнымі злачынствамі з'яўляюцца крадзяжы, хуліганствы і рабаванні. Па лініі крымінальнага вышуку сёлета за сем месяцаў зафіксавана 87 падобных злачынстваў. За знаходжанне ў грамадскім месцы ў нецвярозым стане затрымана звыш 3,5 тысячы чалавек! Лічба, безумоўна, сур'ёзная. Паводле статыстыкі, менавіта распіццё спіртных напояў падштурхоўвае многіх да здзяйснення злачынства.

— Мы неяк сутыкнуліся з наступным выпадкам, — узгадвае Генадзь Завацкі. — Кампанія маладых людзей — жыхары Фаніпаля і Дзяржынска — у 5 гадзін раніцы села ў электрацягнік, які ішоў да Стоўбцаў, і, пакуль ехалі, вырвалі ў цягніку 16 крэслаў, павыкідвалі іх праз вокны. Пасля затрымання прызналіся, што ім... было проста весела. А літаральна днямі ў Жодзіне праваднік адмовіўся прапускаць у вагон п'яных пасажыраў, за што адзін з іх адкрыў агонь па цягніку з пнеўматычнага пісталета. Пасля яны пераселі ў электрычку, дзе іх і затрымалі міліцыянеры.

***— А як звычайна крадуць на вакзале?***

— Спосабы розныя. Многія спакушаюцца на пакінутыя без нагляду чужыя рэчы. Трапляюцца і зладзеі-кішэннікі. Нядаўна супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі «прафесіянала» з расійскага горада Арла, грамадзяніна Украіны, які таксама перыядычна арудаваў на мінскім вакзале.





***— У гэтай справе вам актыўна дапамагаюць камеры відэаназірання?***

— Так, і яны ўстаноўлены не толькі ў Мінску, але і на шэрагу станцый Мінскай вобласці. Безумоўна, не на ўсіх, але гэтае пытанне паступова вырашаецца. Што тычыцца вакзала, то ён як на далоні. На яго тэрыторыі працуе больш за 240 камер відэаназірання, — кажа суразмоўца і заводзіць нас у пакой, дзе на вялікія маніторы выводзіцца карцінка з усіх відэапрыбораў Мінскага аддзела. — У любы момант можна не толькі ацаніць сітуацыю ў любым кутку вакзала, але і прагледзець падрабязнасці злачынства. Вось напрыклад...

Праз некалькі секундаў Генадзь Завацкі ўключае відэа з Калядзіч, на якім звычайнага выгляду мужчына, не падобны на злачынцу, крадзе насценны гадзіннік проста з памяшкання вакзала. Якасць карцінкі такая, што апазнаць злодзея даволі лёгка. Яго, між іншым, вылічылі аператыўна. Зламыснік штодня карыстаўся паслугамі электрычкі. А вось яшчэ адно відэа. Гэта якраз той самы жыхар расійскага Арла, які пакваліўся на чужое, каля вакзальных кас. Мужчына выглядае даволі прэзентабельна. У адной руцэ — валізка, а ў другой — акуратна складзены плашч. Менавіта гэтай рукой ён асцярожна адкрыў сумачку ў адной жанчыны, пасля адышоў, вярнуўся і ў прысутнасці людзей, што стаялі ў чарзе, асцярожна выцягнуў з яе мабільны тэлефон. Мужчына аказаўся прафесійным кішэннікам. Праўда, не ведаў, што стаіць пад самай камерай і ўсё ўбачыць міліцыя...

***— А ці прыцягваюць вакзалы увагу наркагандляроў?***

— Што тычыцца наркотыкаў, мы затрымлівалі іншагароднюю моладзь, якая ездзіла на вакзалы па «закладкі», хавала спайсы ў вагонах. Пры аглядзе міліцыянеры пераважна знаходзілі курыцельныя сумесі.

***— На вакзалах раней пастаянна змагаліся з жабракамі, якіх заўжды хапала. Ці гэтае пытанне ўжо не актуальнае?***

— Мы з імі працуем. Асабліва шмат іх становіцца ў халодны перыяд года. Людзі прыходзяць пагрэцца, многія з іх у нецвярозым стане. У дачыненні іх штрафы не дзейнічаюць. Прыходзіцца ізаляваць ад грамадства праз арышт. Пры гэтым пасля яны адразу трапляюць у спецыяльныя ўстановы, дзе іх мыюць, стрыгуць, аказваюць дапамогу. Проста так мы іх не адпускаем.

## СУМНЫ ПЯТАЧОК

Разам з Дзмітрыем АНІСКОВІЧАМ, камандзірам першага ўзвода роты патрульна-паставой службы, мы падымаемся ў прыгожую, прасторную залу чакання вакзала. Наогул міліцыянеры працуюць тут пазменна, па 12 гадзін. Праца, зразумела, не цукар. Ты пастаянна павінен быць на нагах і ў патрэбны момант мусіш працаваць не толькі з пацярпелымі, але і павінен умець дзейнічаць на папярэджанне, каб прадухіліць злачынства.

Зараз будны дзень, не час пік, а таму людзей адносна няшмат. А вось па пятніцах, суботах тут у некаторых месцах не прайсці, і нярэдка падобнай масавасцю карыстаюцца злачынцы. Менавіта зала чакання з'яўляецца самым крымінагенным месцам вакзала.

— З левага боку шэсць радоў крэслаў... На гэтым пятачку сёлета здзейснілі ўжо пяць крадзяжоў, — кажа Дзмітрый Анісковіч. — Людзі засынаюць, і зладзеі карыстаюцца гэтым, каб забраць чужыя рэчы. Ну а часам пасажыры самі садзейнічаюць падобнаму, калі пакідаюць сваю маёмасць на захаванасць патэнцыйным злачынцам. А бывае, што добрапрыстойныя грамадзяне проста губляюць грошы, якія таксама даволі часта становяцца знаходкай для іншых. Таму не давярайце незнаёмым сваю маёмасць. Не трэба думаць, што людзі ўсе добрыя. На жаль, сярод іх сустракаюцца злачынцы, якія будуць карыстацца даверам.

***— Шматлікія кіёскі ўвагу зладзеяў не прыцягваюць?***

— Не, і з падобнымі выпадкамі мы ўжо даўно не сустракаліся. Затое тры гады таму ў гандлёвым пункце, што ў тунэлі па дарозе да прыпынку «Дружная», кампанія скрала выручку ў касіра. Папрасілі каву, якая стаяла на самай высокай паліцы, і пакуль прадавачка здымала яе, яны скралі грошы. Сума была невялікая, але гэта ўсё роўна крадзеж.

Пры гэтым Генадзь Завацкі, які працуе тут ўжо з тых часоў, калі новы вакзал толькі-толькі даводзілі да ладу, прыгадвае, што раней колькасць злачынстваў тут была невымерна большай, чым цяпер. І людзі сталі больш дысцыплінаванымі, законапаслухмянымі і адказнымі. Спадзяемся, надоўга ■



Фота Надзеі БУЖАН.

# УВАГА — НА ДЗЯЦЕЙ

**За 7 месяцаў бягучага года ў Мінску зарэгістравана 32 дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў. Аб гэтым «Звяздзе» паведаміла Вікторыя ЦАРУК, старшы інспектар агітацыі і прапаганды ДАІ Акцябрскага раёна сталіцы.**

Выпадкаў, пры якіх загінулі дзеці, на шчасце, у Мінску не зарэгістравана. Ад агульнай колькасці пацярпелых дзяцей 65,6% склалі пешаходы, 18,7% — пасажыры, 15,6% — дзеці-веласіпедысты. А вось сітуацыя па краіне крыху іншая. У 192 ДТЗ загінулі 7 дзяцей, 196 атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

— Асноўнымі прычынамі дарожна-транспартных здарэнняў з'яўляюцца парушэнні правіл праезду пешаходных пераходаў, скрыжаванняў, невыкананне правіл манеўравання, — кажа Вікторыя Царук. — Аналіз дарожнага руху сведчыць аб тым, што ў жніўні-верасні ў сувязі з заканчэннем летніх канікул і пачаткам навучальнага года магчыма абвастрэнне праблем дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму.

Нездарма Дзяржаўтаінспекцыя з 25 жніўня па 5 верасня праводзіць спецыяльны комплекс мерапрыемстваў «Увага, дзеці!», а сёння па ўсёй краіне пройдзе адзіны дзень бяспечнага дарожнага руху «Першы і галоўны ўрок — бяспека!». ДАІ звяртае ўвагу на тое, што з пачаткам навучальнага перыяду на вуліцах і дарогах павялічваецца колькасць дзяцей. А таму неабходна быць вельмі ўважлівымі і асцярожнымі пры руху, асабліва паблізу школ.

Дзяржаўтаінспекцыя таксама заклікае ўсіх вадзіцеляў кіраваць транспартам сродкам з уключаным блізкім святлом фар. Таксама важна, каб самі бацькі паказвалі прыклад добрасумленных пешаходаў. Растлумачце дзецям, што не трэба бегчы праз дарогу, асабліва перад транспартам, нельга гуляць каля праезнай часткі. Суправаджайце дзіця да таго моманту, пакуль не пераканаецеся, што яно можа самастойна, бяспечна пераадолець маршрут.

— Дасягнуць істотных вынікаў у бяспецы дзяцей на дарогах можна толькі супольна, — лічыць суразмоўца. — Кожны павінен зрабіць выснову, што толькі строга выконваючы Правілы дарожнага руху можна засцерагчыся ад небяспекі.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

# ДЗВЕРЫ — ПАД КЛЮЧ І...

**Здавалася б, заклік банальны. Многія скажуць, навошта пра гэта лішні раз нагадваць, маўляў, усе аб гэтым дбаюць, але ўсё роўна далёка не кожны такі мінімум выконвае. А пасля засмучаны гаспадар кватэры тэлефануе ў міліцыю і кажа, што яго абакралі. І падобных прыкладаў хапае.**

З апошняга. Летнім ранкам маладая жанчына, якая пражывае ў раёне станцыі метро «Каменная Горка», паведаміла супрацоўнікам Фрунзенскага РУУС сталіцы, што яе абакралі. Гаспадыня засталася без ноўтбука і 350 долараў. У выніку аказалася, што пакуль жыхары кватэры ўначы ціха спалі, злачынца прабраўся ў кватэру праз незамкнутыя дзверы. На шчасце ўладальніцы ноўтбука, міліцыя аператыўна затрымала 30-гадовага жыхара сталіцы. У дачыненні яго ўжо заведзена крымінальная справа.



Што цікава, падобнае злачынства для Фрунзенскага раёна гэтым летам ужо не першае. Раней з незамкнутай кватэры па вуліцы Прытыцкага скралі мабільнік. Міліцыя зноў прыйшла на дапамогу і выявіла злодзея.

— Пры гэтым немалую долю кватэрных крадзяжоў складаюць злачынствы, калі гаспадары самі да сябе запрашаюць знаёмых. А пасля сумеснага распіцця алкагольных напояў госці крадуць мабільныя тэлефоны, ноўтбукі і іншыя рэчы, — расказаў **Андрэй ЛЮБІМАЎ, начальнік Фрунзенскага РУУС сталіцы.**

Менавіта бесклапотнасць гаспадароў даволі часта прыводзіць да знікнення маёмасці. Каб падобнае не здарылася, міліцыянеры раяць абавязкова правяраць, ці замкнуты дзверы, зачынены форткі, устанавіць надзейныя дзверы і замкі.

— Не пакідайце запасныя ключы пад дываном каля дзвярэй, у паштовай скрыні ці ў любым лёгкадаступным месцы, — кажа **Вераніка СТРЭЛЬСКАЯ, прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС.** — Не хавайце каштоўныя рэчы на бачным месцы, сярод кніг і бялізны. Будзьце ў добрых стасунках з суседзямі, каб маглі ў патрэбны момант назіраць за кватэрамі адно аднаго. Калі з'язджаеце на працяглы тэрмін, папрасіце знаёмых забіраць карэспандэнцыю з паштовай скрыні. А калі вы згубілі ключы, не цягніце, неадкладна змяніце замкі. Не ўпускайце ў кватэру незнаёмых. Асабліва папярэдзьце аб гэтым дзяцей, якія застаюцца дома без нагляду дарослых.

— Але самым надзейным гарантам захаванасці вашай маёмасці з'яўляецца абсталяванне кватэр ахоўнай сігналізацыяй, — дадае Андрэй Любімаў. — Падрабязнасці аб яе ўстаноўцы можна атрымаць у найбліжэйшым аддзеле ўнутраных спраў ці ў грамадскім пункце аховы правапарадку.

■ Асоба

# «ГАНАРУСЯ ТЫМ, ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ПЕШАХОД»

**Які дарожны рух быў у сталіцы за савецкім часам? На якіх машынах ездзілі супрацоўнікі ДАІ? Дзе ў Мінску найчасцей здараліся заторы, і ці карыстаўся Пётр Машэраў паслугамі дарожнага эскорту? На гэтыя і іншыя пытанні «Звяздзе» адказаў Канстанцін АНДРОНЧЫК, былы камандзір батальёна дарожна-патрульнай службы Дзяржаўтаінспекцыі Мінска.**




## «Самымі злоснымі парушальнікамі лічылі таксістаў»

— У ДАІ я з 1966 года, сам паходжу з Чэрвеня, — прыгадвае Канстанцін Максімавіч. — На службу трапіў дзякуючы даволі цікавай гісторыі. Я дэмабілізаваўся з войска і прыбыў у нашу сталіцу цягніком «Масква — Мінск». Калі выйшаў на перон, мяне запрыкмеціў маёр унутранай службы, запрасіў да размовы. Спачатку падумаў, што гэта патруль, прадставіўся, паказаў дакументы. Але гутарка пайшла пра іншае. У выніку мне прапанавалі працаваць у міліцыі. Я пакінуў свае кантакты. А праз нейкі час мне даслалі запрашэнне прыбыць у аддзел кадраў гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама. На той момант я быў гатовы здаць дакументы на Мінскі матацыклетна-веласіпедны завод, але прапанова міліцыі апярэдзіла. Спачатку з паўгода папрацаваў у раённым аддзеле ўнутраных спраў Кастрычніцкага раёна, а потым мяне запрасілі ў Дзяржаўтаінспекцыю на пасаду старшага інспектара ў аддзел па рэгуляванні вулічнага руху. З праваахоўных органаў звольніўся ў 1992 годзе ў званні падпалкоўніка міліцыі.

**Раней на праспекце, на кожным скрыжаванні, працавалі рэгуліроўшчыкі. У час пік яны кіравалі дарожным рухам уручную, што садзейнічала хуткаму пропуску аўтамабіляў. І, як мне здаецца, іх можна было б вярнуць.**

***— Канстанцін Максімавіч, сёння дарожна-транспартны рух здаецца даволі шчыльным, насычаным. Але так было не заўсёды...***

— У савецкія часы ў Мінску было значна менш людзей і машын. Я нават памятаю той час, калі падчас перапісу насельніцтва хацелі дасягнуць мільёна жыхароў, каб узняць пытанне перад урадам СССР аб будаўніцтве метрапалітэна. Транспарту, зразумела, было менш. Аўтамабіляў выпускалі не так шмат. Праўда, потым наладзілі масавы выпуск «жыгулёў», і аўтатэхнікі стала больш. Раней на праспекце, на кожным скрыжаванні, працавалі рэгуліроўшчыкі. У час пік яны кіравалі дарожным рухам уручную, што садзейнічала хуткаму пропуску аўтамабіляў. Цікава, усе інспектары рэгулявалі дарожны рух з так званага «рамонка», спецыяльнай тумбы, якую ў горадзе ўжо не ўбачыш. І, як мне здаецца, іх можна было б вярнуць. Усё ж такі з цяперашніх патокаў машын рэгуліроўшчыка наогул не відаць. Ён губляецца. Усю сваю змену інспектары працавалі на скрыжаваннях. І на той час у Ленінскім раёне адбывалася менш аварый, чым у астатніх раёнах Мінска. Усё ж такі супрацоўнікі ДАІ даволі шчыльна «закрывалі» вуліцы. Кожны кіроўца бачыў інспектара і прытрымліваўся правілаў дарожнага руху. Заторы часта ўзнікалі на Партызанскім і Ленінскім праспектах, вуліцы Даўгабродскай. Дарэчы, прыгадаў адзін момант. Самымі злоснымі парушальнікамі ў свой час былі вадзіцелі таксі. Хуткая дастаўка пасажыраў іх заўжды падганяла. Усё гэта ўплывала на іх заробак. Кантроль у дачыненні таксістаў быў узмоцнены. Праўда, ніколі не забуду, як да нашага інспектара, які працаваў каля гасцініцы «Беларусь», падышоў кіроўца, аддаў пад казырок і сказаў: «Таксіст Дзюба са справаздачай прыбыў!» Мы вельмі доўга смяяліся. Такі падыход чалавека адразу зняў усё напружанне, і мы засталіся ў добрых адносінах.

## «Для вадзіцеляў і пешаходаў чыталі лекцыі»

***— А якія пераважалі дарожна-транспартныя здарэнні?***

— Яны былі такія, як і цяпер. У пэўнай ступені адрозніваюцца тым, што тады не адбывалася здарэнняў, напрыклад, з-за размоў па мабільным тэлефоне. На жаль, сёння кіроўцы дрэнна рэагуюць на спецыяльныя сігналы аўтамабіляў хуткай дапамогі, міліцыі, выратавальнікаў. А калісьці мы нават вучылі вадзіцеляў правільна рэагаваць на падобныя сігналы і праводзілі дзеля гэтага вучэнні, асабліва перад пачаткам Алімпійскіх гульняў у 1980 годзе. Пры гэтым мяне ўсцешвае, што сёння амаль няма здарэнняў пры абходзе транспарту. Раней, калі памятаеце, казалі: трамвай абыходзь спераду, а аўтобус — ззаду. Гэтая фармулёўка амаль адышла ў небыццё, а колькасць падобных правапарушэнняў нязначная.

***— Ці былі раней пешаходы больш дысцыплінаваныя, чым цяпер?***

— Гэта было нешта! Мы нават арганізоўвалі спецыяльныя лекторыі. Калі нехта не мог аплаціць штраф альбо не хацеў, мы працягвалі яму запрашальнік на суботнюю лекцыю. І людзі хадзілі ахвотна. Гэта дысцыплінавала і кіроўцаў, і пешаходаў. Сёння я ганаруся тым, што пешаход ідзе выключна на зялёнае святло, а стаіць — на чырвонае. У той жа час мяне непакоіць тое, што сённяшні пешаход лічыць, што толькі ён мае рацыю. Так, дарожны пераход — гэта месца пешахода, аднак ён усё роўна не павінен спантанна, безадказна кідацца на яго. У чалавека нуль увагі на тое, што робіцца на дарозе. Падобнае стаўленне трэба мяняць. Перад тым, як перайсці дарогу нават па пераходзе, грамадзянін павінен паглядзець па баках, пераканацца, што яго хада будзе бяспечнай.

***— У ваш час ліхачоў на дарогах хапала?***

— Так, але тады было замала прыбораў, якія маглі б фіксаваць хуткасць аўтамабіля. Першымі з'явіліся «Спідган» і «Фара», «Бар'ер». Вадзіцелі, дарэчы, тады наракалі, што інспектары часам хаваліся ў звычайных машынах і адтуль фіксавалі перавышэнне хуткасці. З этычнага пункту гледжання гэта не вельмі прыгожа. Аднак цяпер на трасах пачалі ўсталёўваць фотафіксатары, а гэта ўжо больш цывілізаваны метад працы.

***— Якой аўтатэхнікай карысталася Дзяржаўтаінспекцыя?***

— З пачатку 1970-х нам масава пачалі пастаўляць «масквічы», абсталяваныя маячкамі. Потым з'явіліся ўжо і «жыгулі». Яны былі больш сучасныя, утульныя, хуткасныя, манеўраныя. Ад пераследавання ніхто не мог уцячы. І нават «Волга» не магла параўнацца з «жыгулём». Вадзіцелі самі разумелі, што ні да чога добрага ліхацтва не давядзе, стараліся не дапускаць падобнага. Мне як камандзіру ў пагонах удзельнічаць не даводзілася. Але нашы супрацоўнікі, якія працавалі ў начную змену, падобнае практыкавалі. Каб кантраляваць сітуацыю ў горадзе, на працу выходзілі 5-6 экіпажаў. У аўтамабілі абавязкова павінен быў быць «вож» — капронавая стужка з шыпамі, даволі эфектыўны спецыяльны сродак для стрымання правапарушальнікаў, які быў зацверджаны нават на заканадаўчым узроўні. Сярод затрыманых былі ліхачы, якія пападаліся паўторна. Але іх усё роўна было не так шмат, як цяпер. Так, я рады таму, што ў нас такая разумная моладзь, аднак у той жа час вялікая колькасць негатыўных звычак засмучае. Калісьці інфармацыя аб тым, што вадзіцель кіраваў аўтамабілем у нецвярозым стане, траплялa на прадпрыемствы, у прафесійныя камітэты, абмяркоўвалася на камсамольскіх сходах. Гэта сорам, ганьба! За гэта на працы пазбаўлялі прэміяльных, пераносілі адпачынак на зіму. На вуліцы Свярдлова стаяў стэнд са сценгазетай. Дык каля яе ў працоўныя дні прайсці было немагчыма. Усім было цікава, хто з аштрафаваных трапіў у газету...



З кіроўцамі і дружыннікамі размаўляе Іосіф ВАШКЕВІЧ.

## «Фідэля Кастра суправаджалі на матацыклах «Урал»

***— Вы неяк расказвалі, што цэнтр горада літаральна ўздрыгваў ад рову матацыклаў.***

— Безумоўна, у 1980-я гады такая праблема была. І яе разглядаў нават ЦК КПБ. Штрафаваць тых матацыклістаў, якія перавышалі хуткасць, было вельмі складана. Яны ездзілі масава, у групах. Мы вырашылі пайсці на кампраміс і пасябраваць з гэтымі мотагоншчыкамі, адвялі для іх гонак стадыён «Зара».

***— Калі ў Беларусі з'явілася эскартаванне для замежных дэлегацый?***

— Незадоўга да прыезду ў Беларусь Фідэля Кастра, кубінскага лідара, які наведаў нашу рэспубліку ў 1972 годзе. Яго суправаджаў эскортны ўзвод на матацыклах «Урал». Эскорт надаваў значнасць і статус мерапрыемствам, у якіх удзельнічалі госці краіны. Акрамя таго, наш ўзвод суправаджаў прэзідэнта Францыі Жоржа Пампіду, які ў Заслаўі сустракаўся з Леанідам Брэжневым, канцлера Аўстрыі падчас наведвання пабудаванага ў Жлобіне металургічнага завода. А вось Пётр Машэраў, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, як чалавек вельмі сціплы, катэгарычна адмаўляўся ездзіць з суправаджэннем.

***— Год таму вы выдалі кнігу «Дарожны патруль», якая падрабязна расказвае гісторыю з'яўлення, станаўлення дарожна-патрульнай службы ДАІ. А як з'явілася падобная ідэя?***

— Гэта адбылося пасля наведвання ў Маскве музея гісторыі міліцыі. Я вырашыў, што проста абавязаны напісаць падобную кнігу пра нашу службу. Між іншым, яна была самая вялікая ў ДАІ. У батальёне налічвалася 362 міліцыянеры. У архівах, бібліятэках працаваў каля пяці гадоў. Дзякуй спонсарам, якія з паразуменнем паставіліся да неабходнасці падобнага выдання. Пасля выхаду кнігі я адчуў, што пэўную лепту ў агульную гісторыю дарожна-патрульнай службы ўнёс. Цяпер збіраюся напісаць яшчэ адну кнігу, прысвечаную ўсім структурным падраздзяленням ДПС Беларусі ■




Фота Надзеі БУЖАН.

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

Таццяна СТАРЧАНКА:

# «ТРЭБА ЎМЕЦЬ РАБІЦЬ НЕЧАКАНЫЯ РАДАСЦІ»

**Яе «Музычная гасцёўня» збірае аншлагі ўжо значна болей, чым дзесяцігоддзе. Гледачы да апошняга крэсла напаўняюць залу, у якой піяністка Таццяна Старчанка, салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі, іграе класічную музыку і запрашае ў кампаньёны знакамітых музыкантаў, спевакоў, акцёраў. Слухачы прыходзяць да яе зноў і зноў — напоўніцца эмоцыямі, натхніцца прамяністым, інтэлігентным вобразам і атмасферай, якую дзе яшчэ адшукаеш... Спецыяльна для «Звязды» Таццяна Старчанка падзялілася сакрэтамі сваіх творчых поспехаў, сямейнага шчасця і таго, як штодзень быць шчаслівай.**

***— Хачу прызнацца, што за апошні год я стала вашай аматаркай...***

— Гэта вельмі ўдалае слова. «Паклонніца» не падышло б. Ведаеце, у мяне ёсць такі разрад «старой гвардыі» — жанчын у гадах, якія ходзяць на кожнае маё выступленне. Я іх вельмі люблю. Тэлефаную і бясплатна запрашаю на канцэрты. Тут слова «паклонніца» — самае дарэчнае. А для моладзі хочацца падабраць іншае... Няхай і «аматарка». Ці лепей так: паклонніца музычнай гасцёўні. На такую фармулёўку я згодна.

***— Увогуле, вас здзіўляе, што маладыя людзі таксама завітваюць на канцэрты класічнай музыкі?***

— Ні ў якім разе. Філарманічныя сцены дапускаюць абсалютна розныя праграмы. Яшчэ некалькі гадоў таму я выступала з цыкламі канцэртаў у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, Акадэміі МУС, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Асабліва радавала апошні, дзе цудоўныя хлопчыкі, адораныя інтэлектуальна, нават упершыню пачуўшы класіку, успрымалі яе і разумелі. Яшчэ раней, у маладосці, згадвалася выступаць у гімназіях. А быў выпадак, калі падмяняла калег і давялося выйсці на сцэну перад малодшымі школьнікамі — і яны слухалі фартэпіянную музыку. Таму зараз я адэкватна магу сказаць, што ўтрымаю любую аўдыторыю.

***— Адкуль такія поўныя залы? Для таго, каб трапіць у гасцёўню, мы набываем квіткі за некалькі месяцаў...***

— Сапраўды так. Галоўная прычына хаваецца ў наступным: я разумею, што можа быць цікава людзям. Усё ж такі трэба ўмець рабіць тое, што мала хто робіць. Ёсць бяспройгрышныя канцэрты. Напрыклад, на Шапэна ў любым выкананні зала абавязкова збярэцца — толькі зрабі добрую афішу. Ці на ўнікальныя канцэрты накшталт «Музыкі жартуюць» ці «Не толькі танга...». Але ёсць праграмы, якія я лічу сваімі перамогамі. Адна з іх — «Даўніна і сучаснасць: канцэрт беларускай камернай музыкі». Я дакладна ведаю, што, калі б на афішы было напісана толькі гэта, зала не сабралася б.

**Ад адносін, вядома, стамляешся. Таму ўменне радаваць іншага выратоўвае. З гадамі гэта рабіць усё складаней... Але гэта трэба ў сабе культываваць штодзень.**

***— Чаму вы так лічыце?***

— Разумееце, пакуль не будзем любіць сваё, нашы беларускія таленты, нічога не будзе. Я чалавек рускі, які, прыехаўшы ў Беларусь, здзіўляецца, колькі тут выбітных кампазітараў! Але афіцыйна прызнаныя моцна адрозніваюцца ад тых, якіх ведаюць у Еўропе і свеце. Сярод беларускіх творцаў ёсць тыя, хто бліскуча працуе з электроннай класічнай музыкай. У тым канцэрце мы зладзілі першае аддзяленне — беларуская старажытная класічная музыка, а другое — сучасная. І быў такі аншлаг! Пасля выступу людзі падыходзілі з пытаннем: «Калі будзеце паўтараць?» Значыць попыт ёсць. Каб адшукаць такую разынку, важна дакладна разумець, якая сітуацыя зараз на музычным рынку. Для поспеху неабходны хоць бы адзін з трох складнікаў: ці праграма, ці выканаўца, ці канцэрт, якога больш нідзе няма.

***— У вас ёсць усе яны.***

— Так. Але самае галоўнае — гэта каманда аднадумцаў. У маёй гасцёўні няма дрэнных людзей, прытым усе выдатныя музыканты, найлепшыя з усёй краіны. Хаця бывала, што добры чалавек не дацягвае да планкі або геній, няроўны свайму таленту па-чалавечы. З абодвума даводзіцца раставацца. Я ж не магу падманваць публіку і казаць на чорнае белае. Гэта псуе агульную экалогію «Музычнай гасцёўні». Кола музыкантаў вакол мяне можа пашырацца, але яно павінна поўніцца шчырымі, прыстойнымі і прытым таленавітымі людзьмі.

***— Давайце зірнём на гледача. Беларускі наведвальнік гасцёўні, ён які?***

— Я думаю, што адрозненняў беларускага гледача ад еўрапейскага ці расійскага не так шмат, як прынята думаць. Усё ж такі на таленавітае ўсе заўжды рэагуюць аднолькава, нягледзячы на нацыянальныя асаблівасці. У мяне ёсць гісторыя, якая дакладна адлюстроўвае гэтую думку. Вельмі даўно, у юнацтве, я ездзіла на конкурс Моцарта ў Зальцбург. На наступны дзень пасля першага тура іду па мясцовай вулачцы. Раптам з другога боку дарогі перабягае мужчына, нясецца да мяне з бліскучымі вачыма і кажа: «Ой, вы ўчора так ігралі! Гэта было так цудоўна!» Ён кажа па-англійску, а зараз, калі ўзгадваю, у мяне адчуванне, што па-руску. Бо эмацыянальны зарад і выраз твару аднолькавыя для гледача ў любой кропцы свету. А рэакцыя залы — сіла таленту выканаўцы.



Такую «дошку» падарылі калегі.

***— З сакрэтам вашых творчых поспехаў усё зразумела. А што наконт сямейнага?***

— Ведаеце, тут можна казаць пра любоў, моцныя пачуцці, сімпатыю... Але гэта ўсё само сабой. Галоўны сакрэт — у велізарным цярпенні і не меншай працы. І нікуды ад прозы жыцця не падзенешся. Калі ў мяне падрастаў сын, я пастаянна яму казала: «Калі хочаш быць шчаслівым у сямейным жыцці і адносінах, то павінен выхаваць сябе так, каб, з аднаго боку, умець пачуць іншага чалавека, а з іншага — навучыцца рабіць нечаканыя радасці». Ладзіць сюрпрызы — вялікае ўменне і шчасце. Можна жыць у сям'і сумленна, правільна, але так сумна! А калі ты сабраўся прайсці з чалавекам цэлае жыццё разам? Ад адносін, вядома, стамляешся. Таму ўменне радаваць іншага выратоўвае. З гадамі гэта рабіць усё складаней... Але гэта трэба ў сабе культываваць штодзень.



Фота Надзеі БУЖАН.

***— У вас атрымліваецца?***

— Як жа інакш. Хаця так няпроста!.. Асабліва востра адчулася гэта на мінулы Новы Год. У мяне былі канцэрты 30 і 31 снежня. У ноч паміж імі я рабіла торт «Прага» — традыцыйны для нашага сямейнага навагодняга стала. Раніцай у апошні дзень года накрыла стол і пайшла на выступленне. А пасля яго ўсе пайшлі да нас у госці. І тут я зразумела, што гэта сапраўды цяжка. Але магчыма.

***— Няўжо гэта ўсе сакрэты?***

— Не, зразумела. Яшчэ адзін вельмі важны момант — уменне жартаваць. У майго сына былі заканахацці ў англамоўных, абсалютна цудоўных дзяўчат (ён вучыўся ў Англіі). Для іх англійская таксама не родная мова. Я з разуменнем ставілася да гэтага. Але заўжды казала, што не будзе вялікага «сектара» ў вашым жыцці — будзеце смяяцца з розных рэчаў. Не будзе больш цытавання Іосіфа Бродскага і Арсенія Таркоўскага, фразы і жарты з любімых фільмаў — яна проста не зразумее. І тут акажацца, што сумеснае жыццё магчыма, але вельмі складана даецца. Бо мова — яшчэ адна магчымасць прыносіць іншаму радасць. Увогуле, залог поспеху на сцэне і ў жыцці — сваіцца радасцю. Толькі дзе ж яе ўзяць! *(Смяёмся разам.)*

***— Якраз і хацела ў вас запытаць.***

— Мой муж кажа: «Я ажаніўся з такой радаснай, усмешлівай дзяўчынай!» І гэта праўда. Зараз я ўжо не тая. Інакш і быць не магло: вопыт і абставіны не могуць не мяняць чалавека. Але ўмець акумуляваць станоўчыя эмоцыі жыццёва неабходна. Музыкант, насамрэч, можа сабе дазволіць выйсці на сцэну і не свяціцца, толькі калі ён геній. У чым сакрэт поспеху Співакова? У харызме і прыцягальнасці. А свайму сыну, калі ён маленькім з дому выходзіў у дрэнным настроі, пастаянна казала: «Такі твар не носяць!» Ён лічыў, што ў мяне заўжды першамайская дэманстрацыя ў душы. Насамрэч — сіла волі.

***— Але ж ваша праца не абмяжоўваецца ігрой на раялі і аддачай станоўчай энергіі...***

— Гасцёўня — гэта яшчэ і вялікая арганізатарская работа. У выключных выпадках здараецца, што да артыста прыйдуць і адразу прапануюць выступ. Найчасцей мы самі павінны стварыць сабе праекты і рэалізоўваць іх. Натуральна, больш прыемна, калі цябе клічуць на ўсё гатовае. Але так амаль ніколі не адбываецца. І для таго, каб арганізоўваць канцэрты класічнай музыкі, трэба ведаць яе знутры. Як мінімум — мець музычную адукацыю. Мне аднойчы задалі пытанне, ці рыхтую я сабе змену. А як гэта можна зрабіць? Павінна быць пэўная сукупнасць здольнасцей, ведаў і талентаў, каб арганізоўваць, іграць ды яшчэ паралельна расказваць штосьці гледачам.

***— Раз мы ўжо закранулі такую тэму... Прызнайцеся, ці хварэеце? Бо складваецца адчуванне, што ніколі.***

— Зразумела, хварэю, усялякае здараецца. Але «прафесіянал пачынае хварэць на наступны дзень пасля канцэрта, а не за дзень да яго». У мінулым годзе ў мяне быў выключны выпадак. У дзень канцэрта з Англіі вярнуўся сын. І я так зачапілася нагой за адну з сумак, у якой быў абагравальнік, што зламала палец. Добра, што гэта была левая нага (мы ёй не педалізуем). Калі за гадзіну да канцэрта я зірнула на ступню, то зразумела, што ні ў які абутак не ўлезу. Да філармоніі дайшла ў красоўках мужа, на 5 памераў большых, чым мой абутак. Але ж на сцэну так не выйдзеш. Адшукала дома французскія чорныя скураныя тапачкі і падумала, што пад доўгай спадніцай не будзе відаць. Сапраўды так. Музыканты, якія выступалі са мной, зразумелі сітуацыю толькі на паклоне. Калі ўсе сталі ў рад і я аказалася на ўзровень ніжэйшай без абцасаў. А што тычыцца прастуды, то ў кожнага арганізма ёсць рэзервовыя сілы, каб пратрымацца падчас канцэрта і толькі пасля захварэць.

***— Скажыце, калі б вы не былі піяністкай і гаспадыняй гасцёўні, што б рабілі ў жыцці?***

— Думаю, з мяне атрымалася б добрая характарная актрыса. Я нават у маладосці думала сысці ў жанр музычнай эксцэнтрыкі. Але калі казаць пра штосьці не ў творчым рэчышчы, то, мяркую, з мяне б выйшла добрая медсястра. Гэта прафесія, у якой ты сапраўды робіш чалавеку лягчэй і часам нават ратуеш яго. У сілу сваёй станоўча заражанай энергетыкі і магчымасці яе аддаваць я адчувала б сябе на сваім месцы.

***— І ўсе бы хадзілі да вас не на канцэрты, а на перавязкі.***

— Так-так *(смяецца)*. Але яшчэ не ўсё страчана. Калі я буду зусім немаладой, то дакладна ведаю, чым займуся.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*






Фота Надзеі БУЖАН.

## Улад ТАТУР:

# «МАЦІ НЕ ЛЮБІЦЬ, КАЛІ ТРАПЛЯЮ Ў ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПЕРАПЛЁТЫ»

**Улада Татура, спартыўнага каментатара канала «Беларусь-5», я ўпершыню ўбачыў два гады таму. Тады ў Белтэлерадыёкампаніі праходзіў фінал конкурсу каментатараў. Хлопец даволі жвава каментаваў прапанаваны яму «кавалак» футбольнага матча, а пасля ўпершыню адказваў на пытанні журналістаў. Пройдзе паўтара года — і спартыўныя інтэрнэт-рэсурсы пачнуць разбіраць яго эфіры на цытаты, называць «першым беларускім спартыўным каментатарам новага пакалення». Мы сустрэліся з Уладам і гадзіну прагаварылі пра родны для яго Салігорск, канкурэнцыю ў футбольным чэмпіянаце Беларусі і нядаўнюю пікіроўку з кіраўніцтвам жодзінскай каманды «Тарпеда-БелАЗ».**

***— Бягучае лета для цябе стала, напэўна, самым іміджавым. Пра цябе шмат пісалі, абмяркоўвалі. Асабліва пасля матча паміж «Тарпеда» і албанскім «Кукесі» ў Лізе Еўропы, калі ты раскрытыкаваў гульню беларускай каманды.***

— Кажуць, што чорны піар — гэта таксама піяр. Не скажу, што я не хачу, каб пра мяне пісалі, але да ўсяго падобнага стаўлюся даволі спакойна, асаблівай папулярнасці, празмернай увагі да сваёй асобы не адчуваю. Што тычыцца гульні з удзелам каманды з Жодзіна, я не думаў, што яна стане такой рэзананснай. Наогул лічу, што гісторыя раздзьмутая. Гэта быў абсалютна звычайны эфір, які нічым не адрозніваўся ад астатніх. Магчыма, я крыху перагнуў, аднак казаў аб тым, што сапраўды адбывалася на полі. І рэакцыя кіраўніцтва «Тарпеда-БелАЗ», на мой погляд, была няправільнай.

***— Падчас гэтай пікіроўкі нехта нават засумняваўся ў наяўнасці ў цябе дыплома аб вышэйшай адукацыі.***

— Сёлета я закончыў вочнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «міжнародныя інвестыцыі». Вучыўся, насамрэч, нядрэнна. Перадач у мяне ніколі не было. Узяў ад універсітэта тое, што і хацеў: адкрыў для сябе выдатных людзей і валоданне замежнымі мовамі. Два гады я сумяшчаў вучобу з працай. Момантамі было складана. Калі ў сталіцы адбываўся чэмпіянат свету па хакеі, у мяне ўзнікала жаданне ўстанавіць на «Мінск-Арэне» раскладушку. Але ва ўніверсітэце да маёй працы ставіліся з паразуменнем.

***— А калі зацікавіўся футболам?***

— У 1999 годзе бацька набыў мне мяч, а неўзабаве я схадзіў на хатні матч салігорскага «Шахцёра». Тады на стадыёне "Будаўнік" не было казырка, стаялі звычайныя лаўкі. Пры гэтым людзей на футбол прыходзіла шмат. Больш за 4 тысячы чалавек на футболе было дакладна. Гэта заўважалі ўсе. Я прысутнічаў літаральна на ўсіх хатніх матчах і прапусціў толькі сустрэчу з мінскай «Зоркай-БДУ», у якой «Шахцёр» перамог з лікам 9:1, дасягнуў сваёй самай буйной вікторыі ў Вышэйшай лізе. Я лічу, што «Шахцёр» узору 2004 і 2005-х гадоў — гэта адзін з найлепшых калектываў у суверэннай гісторыі нашага футбола. Каманда амаль не прапускала, заваявала Кубак Беларусі, стала чэмпіёнам краіны. У атацы тады гулялі Сяргей Нікіфарэнка і Аляксандр Кліменка. Апошняга я наогул лічу самым лепшым нападаючым у тагачасным беларускім футболе. Ён валодаў цудоўным гульнявым стылем. Паралельна па часопісе для налепак, прысвечаным чэмпіянату Італіі, я засвойваў сусветны футбол. Часопіс з'явіўся ў мяне запозна, налепкі для яго ўжо не прадаваліся, але ў ім прысутнічала інфармацыя пра выдатных футбалістаў, можна было лёгка ўзбагаціць свае веды. Чытаў кнігі, глядзеў матчы чэмпіянату Еўропы-2000. З гэтага ўсё пачыналася...

**Момантамі было складана. Калі ў сталіцы адбываўся чэмпіянат свету па хакеі, у мяне ўзнікала жаданне ўстанавіць на «Мінск-Арэне» раскладушку.**

***— Восень 2013 года, напэўна, кардынальна змяніла тваё жыццё. Тады адбыўся фінал конкурсу каментатараў Белтэлерадыёкампаніі. Мне нават здалося, што ты асабліва не хваляваўся.***

— Я б так не сказаў. І глядзець тыя запісы я б зараз нават не адважыўся. Шчыра кажучы, тады мне здавалася, што былі заяўкі, мацнейшыя за маю.

***— Рашэнне паўдзельнічаць прыняў вокамгненна?***

— Так, пра конкурс даведаўся ад сябра. Для яго трэба было зрабіць запіс і адаслаць у Мінск. З гэтым мне дапамог Кірыл Паўловіч, фатограф салігорскага «Шахцёра», які можа зрабіць з фота і відэа літаральна ўсё. Ён тады працаваў на салігорскім тэлебачанні, дзе я здолеў запісаць гук у нармальнай студыі, накласці на відэа. Атрымалася даволі добра.

***— А адкуль у цябе прага да каментавання?***

— Я абмяркоўваў футбол заўжды і ў любой кампаніі. Гэтым, магчыма, нават надакучваў людзям, але амаль усе мае сябры спорт любяць. Дарэчы, агучваў у сяброўскім коле не сапраўдны футбол, а нашы матчы на гульнявой прыстаўцы Play Station. Цяпер у яе гуляем радзей, але можам спакойна зладзіць 10-гадзінны марафон гульні. Ствараем паміж сабой паўнацэнныя турніры і спаборнічаем.

***— Свой першы матч памятаеш добра?***

— Так, разам з Аляксандрам Цвячкоўскім каментаваў паядынак англійскай Прэм'ер-лігі. Ён быў жудасным — і з пункту гледжання майго каментавання, і з-за таго, што адбывалася на полі. Пры гэтым з Цвячкоўскім працуецца добра. Ён дае магчымасць выказацца, не перарывае, у пэўны момант можа падтрымаць. Першы самастойны матч я правёў вясной 2014 года, і тады зразумеў, што гэта ў тысячу разоў складаней, чым працаваць у пары. Ты цалкам павінен запаўняць эфір, без перапынку. Па адчуваннях мне здалося, што з рэпартажам тады справіўся.

***— Як, дарэчы, рыхтуешся да эфіраў?***

— На матчах чэмпіянату Англіі магу працаваць амаль без падрыхтоўкі. Але я ўсё роўна заходжу на афіцыйны сайт чэмпіянату, пампую 55 старонак з англамоўным тэкстам і чытаю іх перад матчам. Рэч даволі карысная, і калі ты перад гульнёй адкрыў гэты сайт, папрацаваў з ім, больш табе для трансляцыі нічога не трэба. Вельмі важна падчас рэпартажа мець пад рукой інтэрнэт. Дзеля гэтага прыношу з сабой ноўтбук, а падчас трансляцыі аператыўна адсочваю цікавую і карысную статыстыку.

***— Самыя яскравыя свае памылкі прыгадаеш?***

— А такіх, на шчасце, не было. Большасць маіх памылак звязана з мовай. Паўторы слоў, напрыклад. Каб гэтага не здаралася, трэба больш чытаць мастацкай літаратуры. Гэта відавочна. Футбольная лексіка даволі вузкая, трэба выкарыстоўваць разнастайную мову. У літаратуры даволі шмат абаротаў, якія можна скарыстаць у эфіры.

***— Што за два гады працы на тэлебачанні цябе найбольш уразіла?***

— Тое, што многія проста недаацэньваюць працу каментатара, думаюць, што гэта вельмі лёгка. Аднойчы для інтэрнэт-трансляцыі ў Салігорску, каб было цікавей, запрасіў у эфір свайго сябра. Шчыра кажучы, ён быў крыху шакіраваны, адчуваў вялікія цяжкасці.

***— Уладзімір Навіцкі ў інтэрв'ю расказваў мне, што падчас трансляцыі з Іспаніі ён сядзеў сярод мясцовых гледачоў, і яны спрабавалі частаваць яго віном. А што забаўнае адбывалася з табой падчас эфіраў?***

— Я наогул не люблю працаваць у падобных умовах. На многіх беларускіх стадыёнах няма абсталяваных каментатарскіх пазіцый, і яны знаходзяцца проста сярод балельшчыкаў. Калі працаваў у Наваполацку, адчуваў нешта падобнае. Тады мясцовы «Нафтан» гуляў з БАТЭ. У трох кроках ад мяне сядзелі заўзятары БАТЭ, з іншага боку — прадстаўнікі мясцовай каманды, а ззаду — мясцовыя балельшчыкі, якія пастаянна лезлі ў мой тэлевізар падглядзець спрэчныя моманты. Сканцэнтравацца было вельмі складана. Многія рэчы проста скоўвалі. За магчымасць адасобіцца ў каментатарскай кабіне я люблю «Барысаў-Арэну». Умовы для вядзення трансляцыі мне падабаюцца ў Гомелі. І мне хочацца, каб там часцей гуляла наша зборная. Нядрэннае месцазнаходжанне каментатарскай кабіны ў Жодзіне, хаця агляду замінаюць металічныя перагародкі на вокнах.

***— Ты, калі не памыляюся, ужо паспеў папрацаваць у эфіры разам з запрошанымі экспертамі...***

— Так, разам з былым варатаром зборнай Беларусі Васілём Хамутоўскім. І я ўсцешаны, што ён з'явіўся на нашым тэлебачанні. Падчас эфіраў на яго прыемна паглядзець, яму заўжды ёсць пра што сказаць. Васіль ахвотна ідзе насустрач. Мы часта робім трансляцыі, у якіх гутарым з футбалістамі на камеру ў перапынку, пасля гульні. І мне часам здаецца, Васіль адчувае твае праблемы, сам спускаецца да цябе з трыбуны, каб дапамагчы. Чалавек абсалютна адкрыты, аднак ім не трэба злоўжываць. Варта, каб былі і іншыя эксперты з ліку спартсменаў, але іх замала. І гэта праблема.



***— Усё часцей у футбольных праграмах з'яўляюцца прыгожыя дзяўчаты, якія ў спорце не заўсёды разбіраюцца, але для карцінкі проста выдатныя.***

— Стаўлюся да гэтага без захаплення. Прыемна, калі на экране з'яўляюцца дзяўчаты, аднак іх павінна хапаць у звычайным жыцці. Калі яна не разбіраецца ў дысцыпліне, які з яе толк? Падобнае дэвальвуе прафесію. Знайсці ў адной асобе і прыгажуню, і добрага спецыяліста складана, але магчыма. Дык давайце шукаць такіх і не дапускаць у эфір тых, хто не валодае тэмай.

***— Ты задаволены бягучым футбольным сезонам?***

— Не. Многае вырашае эфект прысутнасці. Калі ты прысутнічаеш на трыбуне, глядзіш на футбол, усё здаецца нармальным. Але калі чэмпіянат адсочваць паводле статыстыкі, праз інтэрнэт, гэта вельмі нецікава. У нас замала інфармацыйных нагод. І гісторыя з матчам жодзінскага «Тарпеда» стала так абмяркоўвацца толькі таму, што ў нашым футболе не хапае падзей, зрухаў.

***— Ты не прыхільнік погляду, што свой футбол трэба любіць толькі таму, што ён свой?***

| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221282904601000212, площадью 0,1498 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, ул. Пионерская, 8 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (озеро Зароновское); охранная зона линий электропередачи до 1000В. **Начальная цена**: 11 109 700 бел. руб. **Размер задатка:** 1 110 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314060087 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполком |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 29.09.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 28.08.2015 с 8.30 по 28.09.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем.участка не позднее 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос.регистрации права на него; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221887001601000115, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Ботали, пер. 2-ой, 7 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (оз. Лосвидо). **Начальная цена**: 13 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 300 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316087000 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ 207, код 635, УНП 300066527, код платежа 04901, получатель платежа: Пальминский сельский исполком |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 14.09.2015 в 14.00. по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 28.08.2015 с 8.30 по 11.09.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешение на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.02.2015 |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000003009271, площадью 0,1300 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 9 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 223 598 284 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №240100000003009127, площадью 0,1083 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 5 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 139 702 280 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №240100000003009128, площадью 0,1180 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 5А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 152 209 900 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №240100000003009274, площадью 0,0882 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Прибережная, в районе дома 8 (участок №4) для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина); охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 158 597 180 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №240100000003009279, площадью 0,0883 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Прибережная, в районе дома 8 (участок №5) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина); охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 158 765 656 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №6. Земельный участок с кадастровым №240100000003054535, площадью 0,0916 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Прибережная, в районе дома 8 (участок №6) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина); охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 158 695 870 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.10.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 28.08.2015 с 8.30 по 30.09.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр. лица Республики Беларусь. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл.управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский городской исполком. **Условия аукциона:** получит разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юр. лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

# ФАНТАСТЫКА?

## Як навука набліжае неўміручасць да рэальнасці

**Пошукі Понсэ дэ Леонам фантана вечнай маладосці могуць быць легендай, але асноўная ідэя — пошук лекаў ад старасці — цалкам рэальная. Людзі спрабавалі ўзламаць код вечнай маладосці амаль з самага пачатку існавання чалавецтва. Мы паспрабавалі ўсе, што маглі ўявіць, ад чароўных аб'ектаў і эпічных падарожжаў да ахвярапрынашэнняў і ўжывання крыві (таксама вынайшлі монстраў, якія жывуць вечна, папіваючы крыў). Заставалася толькі пытанне часу, калі навука ўвяжацца ў гэтыя пошукі, і некаторыя рэальныя крокі ў гэтым кірунку ёй усё ж удалося зрабіць.**

### НАВУКОВЫЯ ПОШУКІ НЕЎМІРУЧАСЦІ

Старэнне на малекулярным узроўні не мае ніякага сэнсу. Нашы целы пастаянна ствараюць новыя клеткі і аднаўляюць нашы натуральныя здольнасці аховы, але мы ўсё роўна старэем. Энтрапія забірае самых лепшых з нас, і мы прымаем гэта як непазбежнае, хоць навука зрабіла вялізны крок наперад, павялічваючы нашу працягласць жыцця. За мінулае стагоддзе чаканая працягласць жыцця вырасла, і людзі ў развітых краінах могуць пражыць каля 80 гадоў, што нашмат больш, чым 47 гадоў у 1900 годзе. Гэта павелічэнне абумоўлена ў большай ступені дасягненнямі ў лячэнні дзіцячых хвароб, але яно таксама прывяло да росту хранічных захворванняў у старасці. Хваробы сэрца, рак, хвароба Альцгеймера — гэта сур'ёзныя праблемы, і кожная з іх лечыцца індывідуальна ці не лечыцца зусім. Было б нашмат прасцей проста праглынуць таблетку і актывізаваць рэсурсы арганізма.



Навукоўцы добра ведаюць пра гэтыя праблемы і пастаянна выпрабоўваюць розныя метады па аднаўленні жыццяздольнасці чалавечага цела. Аднаўленне гамеастазу, ці здольнасці цела самастойна стабілізаваць свае сістэмы ў адказ на стрэс накшталт фізічных нагрузак, спякотнага або халоднага надвор'я, высокай ці нізкай асветленасці, — гэта асноўны напрамак. Чалавечае цела — гэта перш за ўсё складаная біялагічная машына, а стары ўзрост — гэта, па сутнасці, механічная праблема, з якой трэба змагацца. І калі рашэнне гэтай праблемы заключаецца ў тым, каб падтрымліваць людзей здаровымі і свабоднымі ад хвароб як мага даўжэй, то ў навукі вельмі добрыя шанцы з гэтым справіцца.

Самы вялікі нягоднік, які перашкаджае нам жыць доўга, гэта фермент целамераза. Адкрытая доктарам Элізабэт Блэкбэрн (якая атрымала Нобелеўскую прэмію за сваё адкрыццё), целамераза паўтарае паслядоўнасці ДНК на канцы ланцужка храмасом, якія пакрываюць кожны ланцужок і вызначаюць пачатак наступнага. Яна адказная за паведамленне нашым клеткам, калі трэба спыняць рост, і кожны раз, калі пакрывае ланцужок, маленькая частка інфармацыі клеткі пра тое, як трэба перабудоўвацца, губляецца. У выніку навукоўцы шукаюць спосабы прадухіліць страту або актывізаваць целамеразу, калі яна не можа змагацца са старэннем на малекулярным узроўні.

Тым не менш навука не заўсёды ведала, што праблема заключаецца ў целамеразе, таму на працягу навуковай гісторыі прапаноўваліся іншыя рашэнні. Авіятар Чарльз Ліндберг спрабаваў падмануць смерць у пошуках спосабу замены нашых органаў машынамі, падобна на тыя, якія лекары выкарыстоўваюць у сучаснай медыцыне для часовай замены лёгкіх. Кланіраванне, кібаргі, нанатэхнічнае аднаўленне клетак і 3D-друкаваныя органы — гэта працяг лініі думкі Лінберга, якую складана назваць няслушнай. У любым выпадку ўсе гэтыя метады грунтуюцца ў першую чаргу на замене частак цела, а не на прыпыненні старэння.

Пісьменнікі-фантасты часта прапануюць загрузіць чалавечы мозг у камп'ютар і такім чынам дасягнуць неўміручасці, і навука рэальнага свету кажа, што гэта цалкам магчыма. Так званая «эмуляцыя цэлага мозга» дазволіць навукоўцам прасунуць нас да гэтай формы несмяротнасці, а ў далейшым стварыць нейронавыя прылады, якія дазволяць працаваць з чалавечым целам таксама, як наш мозг, а значыць, стварыць «вечны мозг». Навуковая фантастыка таксама падказала нам ідэю крыягеннага захавання чалавечага цела шляхам запаволення метабалізму і захавання рэсурсаў — працэй кажучы, замарожвання. Але гэтая мера хутчэй ахоўная, чым асноўная, якая вырашыць праблему.



### БЯГУЧЫЯ НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

Навукоўцы Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Сан-Францыска паспяхова звярнулі эфекты старэння і хвароб старасці ў мышэй шляхам інфузіі крыві маладых мышэй у старых. У прыватнасці, яны высветлілі, што кроў 3-месячнай мышы аднаўляе памяць, здольнасць да навучання і функцыі мозга ў 18-гадовай мышы (эквівалент 70-гадовага чалавека). Навукоўцы таксама выявілі, што калі яны ўводзілі толькі плазму ў старых мышэй, тыя павялічвалі цягавітасць і маторную функцыю, становячыся з 3-месячнымі на адзін узровень. Навукоўцы нават змаглі вызначыць хімічны сігнал, канкрэтны бялок, які выступае ў якасці асноўнага рэгулятара мозга і актыўнасць якога павышаецца з маладой крывёю. Аднак справа ў тым, што няма канкрэтнага механізму або лекаў, якія вырашаць усе праблемы са старэннем — і яго навукоўцы плануюць знайсці, калі пачнуць эксперыментаваць з людзьмі.

Крамянёвая даліна — асноўны цэнтр навуковай працы над старэннем. Google стварыла Calico Labs, каб заняцца зваротам старэння назад і стварэннем лекаў, якія дапамогуць нашай біялогіі. Human Longevity засяроджана на стварэнні базы даных у 1 мільён паслядоўнасцяў чалавечых геномаў да 2020 года, каб павысіць якасць барацьбы са старэннем. Узнагароды Palo Alto Longevity Prize, кожная па 500 000 долараў, былі прысуджаны за «інавацыі ў галіне аднаўлення гомеастатычнай здольнасці арганізма» і «садзейнічання падаўжэнню стабільнага і здаровага жыцця». Заяўленыя мэты ўсіх такіх кампаній — распрацаваць метады барацьбы са старэннем і хваробамі старасці канкрэтна, але на самой справе ўсё яны, магчыма, набліжаюць нас да неўміручасці.

Чаму Крамянёвая даліна ўдзельнічае ў гэтым? Обры ды Грэй, адзін з піянераў галіны, лічыць, што паспяховая медыцына для барацьбы са старэннем мае патэнцыял стаць «найбуйнейшай індустрыяй з тых, якія калі-небудзь існавалі, з вялікімі магчымасцямі для здабывання прыбытку».

**hi-news.ru**

# ЯК ЛЮДЗІ АБАРАНІЛІ СЯБЕ АД ВІРУСАЎ

**Амерыканскія спецыялісты прыйшлі да высновы, што ў чалавека ў геноме віруснай ДНК значна менш, чым у іншых жывых арганізмаў.**

Дзякуючы таму, што першабытныя людзі змянілі зубы на прылады, перасталі кусаць сваіх ворагаў і з дапамогай зубоў здабываць ежу, сёння чалавек менш схільны да захворванняў на рознага кшталту вірусы, чым раней. Для доказу сваёй тэорыі эксперты правялі параўнанне ўплыву рэтравіруса на ДНК чалавека і на ДНК яшчэ трыццаці дзевяці розных істот, у лік якіх увайшлі таксама шымпанзэ, дэльфіны і панды.

У выніку навукоўцы ўстанавілі, што рэтравірусы эндагеннага тыпу, або ЭРУ, на сённяшні дзень практычна не наносяць шкоды здароўю людзей, у той час як асобіны, якія дасягаюць жаданага пасродкам укусаў, могуць у значнай ступені ад іх пацярпець. Акрамя таго, эксперты высветлілі, што за тры мільёны гадоў у геноме чалавека наогул не траплялі новыя віды вірусаў. Яны звязваюць гэта з тым, што колькасць кантактаў з крывёй у людзей у значнай ступені скарацілася.



# РАСТАВАННЕ ЛЕДАВІКОЎ:

## пільнае вывучэнне ці час для панікі?

### Фота з Грэнландыі

Супрацоўнікі амерыканскага касмічнага агенцтва НАСА апублікавалі на днях на афіцыйным сайце ведамства ўнікальныя здымкі. На іх адлюстраваны кадры працэсу раставання ледавіка на востраве Грэнландыя. Фотаздымкі ўдалося зрабіць з дапамогай спецыяльнага спадарожніка Aqua.



Як вядома, паступовае раставанне ледавікоў на самым вялікім востраве нашай планеты хвалюе спецыялістаў усяго свету. Пакуль канчатковай версіі незваротнага працэсу не назвалі. Але ёсць некалькі варыянтаў.

Па-першае, навукоўцы лічаць, што на працэсы раставання ўплывае не толькі глабальнае пацяпленне. Аказваецца, Грэнландыю падаграе падземная плынь магмы. Па-другое, востраў падтае праз ападкі ад шматлікіх лясных пажараў на тэрыторыі Канады і Злучаных Штатаў Амерыкі. Справа ў тым, што цёмная сажа асядае на паверхні ледавікоў, пры гэтым здольнасць адбіваць сонечныя прамяні значна памяншаецца. Працэй кажучы, запэцканыя ледавікі будуць награвацца значна мацней. У выніку Грэнландыя больш інтэнсіўна паглынае сонечную энергію. Навукоўцы на працягу некалькіх гадоў фіксуюць анамальнае раставанне самага вялікага вострава нашай планеты, і каманда кліматолагаў з усяго свету спрабуе ўсталяваць, якая ж самая дакладная прычына раставання ледавікоў.

### Працэс ідзе хутчэй

Ледавікі Грэнландыі, якія выходзяць у акіян, ляжаць на большай глыбіні, чым меркавалася раней, што дазваляе акіянскім водам моцна падмываць іх. Гэты працэс можа павысіць узровень мора на планеце значна хутчэй за папярэднія ацэнкі. Такія вынікі атрымала каманда даследчыкаў на чале з Эрыкам Рыньё з Каліфарнійскага ўніверсітэта і Лабараторыі рэактыўнага руху NASA.

Даследчыкі на працягу трох гадоў змагаліся з неспакойнымі водамі паблізу Грэнландыі, каб скласці першую ў свеце карту падводных ледавікоў. Вынікі даследавання былі апублікаваны ў вядучых навуковых часопісах, у тым ліку ў Geophysical Research Letters, а таксама даступныя ў інтэрнэце.

Рыньё і яго калегі Ян Фенці з JPL, Чылан Чай і Юн Кзю з UCI і Крыс Тэмп з Terrasond Ltd. атрымалі і прааналізавалі значэнні глыбіні, салёнасці і тэмпературы глыбінных вод, а таксама даследавалі іх уплыў на кромку ледзяного покрыва Грэнландыі. Навукоўцы выявілі, што некаторыя ледавікі ляжаць на гіганцкіх земляных парогах, што абараняе іх ад уздзеяння салёных вод, у той час як іншыя размяшчаюцца непасрэдна на марскім дне і моцна размываюцца салёнымі водамі, а гэта азначае, што яны могуць абрынуцца і растаць значна раней. «Раннія прагнозы не ўспрымалі гэты факт як вельмі важны, і, як вынік, недаацэньвалі, як хутка ледавікі будуць рэагаваць на змены клімату», — адзначаў Рыньё.

### Ледавікі будуць разбурацца

Таксама, па звестках NASA, 2015-ты можа стаць годам з самай нізкай плошчай ледзянога покрыва. Адзначаецца, што колькасць лёду ў Арктыцы памяншаецца з павышэннем глабальнай тэмпературы, бо гэты рэгіён больш адчувальны да змен клімату, чым уся Зямля ў цэлым. Раней навукоўцы прагназавалі, што гэтым летам у сувязі з глабальным пацяпленнем ледавік Ларсена ў Антарктыдзе канчаткова спыніць сваё існаванне і расколецца на мноства айсбергаў.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by

■ Глядзіце, хто прыйшоў!

# РОК ЖЫЦЦЯ

Беларускі (у прыватнасці беларускамоўны) рок — гэта легенда, якая нараджалася недзе ў 80-я гады. Але легенда жывая, якую немагчыма спісаць і забыць, пакуль ёсць у людзей жаданне слухаць рок па-беларуску. Ёсць магчымасць: вяртаецца гурт «Крама». Вяртаецца канцэртам, прысвечаным 55-годдзю лідара і саліста Ігара Варашкевіча (30 жніўня, у месцы сімвалічным — «Сябры»). Немагчыма абысці ўвагай сам факт гэтага вяртання: Варашкевіч быў верны сабе (музыцы, якой займаўся), кірунку, у якім працаваў, і мове, на якой спяваў. Беларуская — гэта рок яго жыцця.

Так і было. Калісьці пачуць, як гучыць рок па-беларуску, мне ўдалося дзякуючы Варашкевічу. Быўшы студэнткай, трапіла на адзін з канцэртаў у Тэатральна-мастацкім інстытуце, дзе выступала тады «Бонда», адзін з першых беларускіх рок-гуртоў. Тады, яшчэ за савецкім часам, папулярнасць песень на беларускай мове ўжо была даказана «Песнярамі» ды «Сябрамі». Але тыя былі ўлюбёнцамі маіх бацькоў. А нашаму пакаленню хацелася зусім іншых рытмаў. І беларуская мова з імі спалучалася цудоўна. Далей гэта сцвярджала «Крама» — гурт, які актыўна працаваў у 90-я, салістам быў таксама Варашкевіч. Наогул гэта быў час дзіўны, калі не ў апошнюю чаргу дзякуючы музыкам, якія выконвалі рок у самых розных яго кірунках, павялічвалася колькасць прыхільнікаў беларускай мовы. Гурт запісаў шэраг альбомаў, атрымаў «Рок-карону» ў 1994 годзе і неаднаразова адзначыўся на «рок-каранацыях» за вернасць традыцыі. «Крама» і сапраўды была верная сабе, не здрадзіўшы ні свайму стылю, ні беларускай мове. На ёй спявае «Крама» і Ігар Варашкевіч і цяпер. Ужо пасівелы. Але не толькі там, за межамі нашай краіны, ёсць музыкі, да якіх хочацца ставіцца, як да легендаў. Сваю справу яны рабілі і робяць шчыра, таму гэта заслугоўвае ўвагі. І калі гэта ёсць, значыць, некаму патрэбна. Ствараць на роднай мове — усё ж удзячная справа.

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Выстава

# Выйсці са сховішчаў

## Пазнаём імёны беларускага мастацтва дасавецкага і савецкага часу



Міхаіл Сеўрук. На сенажаці.

Між іншым, іх шмат, як і твораў айчынных аўтараў ХХ стагоддзя ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. І хоць частка гэтай калекцыі прадстаўлена ў пастаяннай экспазіцыі, усё (ці ўсе імёны і творы) адлюстраваць на ёй немагчыма. Але на выставе «Плынь часу» ёсць магчымасць пазнаёміцца з творамі тых мастакоў, у каго сёлета быў бы альбо ёсць асабісты юбілей. Некаторым у 2015 годзе 140 гадоў са дня нараджэння, некаму 110 ці 90, камусьці 80 ці 70. Але выстава цікавая не толькі імёнамі юбіляраў, але і творамі, якіх тут каля 100 — жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Такім чынам музей знайшоў магчымасць паказваць свае калекцыі, з'явіўся нават спецыяльны праект для гэтага, у рамках якога ладзяцца групавыя выставы ўжо з 2008 года.

Гэтая выстава цікавая тым, што ёсць магчымасць адчуць вобраз эпохі ці розных перыядаў аднаго стагоддзя. Стагоддзя вельмі важнага для айчыннага мастацтва, якое адлюстроўвала ўсё тое, чым жыла рэспубліка, тое, якія змены ў ёй адбываліся. І як адыходзілі ідэі ці здавалі свае пазіцыі дамінуючыя мастацкія кірункі, так і творы. Але яны здабытак рэальны, той, што ствараўся і збіраўся пакаленнямі (калісьці іх набываў музей). Ёсць сярод сёлетніх юбіляраў аўтары знакавыя, творы якіх прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі беларускага мастацтва: гэта скульптар Андрэй Бембель (сёлета яго 110-годдзе), жывапісцы Міхаіл Сеўрук (110), Адольф Гугель (100), Мікалай Залозны (90) і іншыя. Але ёсць жа карціны, якія ў запасніках. Дык калі ласка — вось яны, даступныя вачам шырокай публікі. Патрэбна нагода, каб яны адтуль выйшлі — вось хоць бы такая юбілейная выстава. Доўжыцца яна амаль да канца верасня. Час зразумець беларускае мастацтва і саміх мастакоў, якія працавалі ў вельмі няпростае стагоддзе.



Мікалай Залозны. Кветкі і садавіна.

Але ж можна яшчэ трошкі больш даведацца пра беларускае мастацтва (і мастакоў) дасавецкага перыяду. Некаторыя імёны могуць наогул стаць адкрыццём — як Яніслаў Валакіта (верагодна, псеўданім, ёсць нават некалькі версій, каму ён мог належаць), аўтар ілюстрацый да кніг, якія, дарэчы, на пачатку ХХ стагоддзя выходзілі ў выдавецтвах Вільні. Ці Уладзімір Гулецкі, ураджэнец Вілейшчыны, які пасля Першай сусветнай вайны застаўся ў Расіі, жыў у Сібіры, Але выстаўляўся на радзіме, у Беларусі, у прыватнасці ў 1945 годзе, ад таго часу ў нашым музеі засталося некалькі яго твораў. Такіх творцаў, якія нарадзіліся ў Беларусі, але жылі па-за яе межамі, даволі шмат. У кожнага склаўся свой шлях у мастацтве: напрыклад, Вячаслава Руцая жыццё прывяло ў Маскву, а вучыцца маляваць ён пачынаў у Мінску, у школе Якава Кругера (праз яе прайшлі Хаім Суцін, Міхаіл Кікоін, якія апынуліся ў Парыжы, а таксама Заір Азгур, Іван Ахрэмчык, Міхаіл Станюта, якія сталі класікамі беларускага мастацтва). Шляхі мастакоў (ці тое, што мы пра іх ведаем), як і іх творы — цудоўная нагода, каб паразважаць пра тое, якія часы выпалі на лёс Беларусі. Розныя. Але нават вось той савецкі перыяд, афарбаваны ідэяй, даў нам багата творцаў, кожны з якіх дадаваў ва ўмоўны мастацкі партрэт нашай краіны нейкую сваю фарбу. Ці адценне (калі гэта быў адзін колер, узяты за аснову). Ці погляд на рэчы. І нават калі этап завершаны, разумець яго — гэта значыць лепш адчуваць, што шукае наша мастацтва ў часе сённяшнім, што яно імкнецца перагледзець, ад чаго адысці, а што пакінуць як памяць ці як традыцыю, вельмі важную як глеба для развіцця.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ На вялікім экране

# БУДУЧЫ МЕСЯЦ АБЯЦАЕ БЫЦЬ НАСЫЧАНЫМ

**У верасні мае быць шмат нагод, адпаведна і матэрыялаў, звязаных з кіно. Таму мы вырашылі адразу, перад пачаткам месяца расказаць, што ў гэтыя трыццаць дзён будзе ўяўляць сабой вялікі экран і на якія паказы варта трапіць.**

Абнаўляецца праграма праекта Cinemascope, галоўнага пастаўшчыка класічных твораў кінамастацтва; свае прапановы ўносіць Art Corporation, што працягне серыю паказаў «Лістапад. Калекцыя» ў сталічным кінатэатры «Перамога». Акрамя іншага, у традыцыйнай афішы «Кінавідэапраката» таксама з'яўляюцца цікавыя пункты.



Джэк Нікалсан у трылеры «Кітайскі квартал» Рамана Паланскі.

**1.** Аціаніць акцёрскі дуэт Крыстэн Сцюарт і Джэсі Айзенберга, што зараз здымаюцца ў новым фільме Вудзі Алена (яго пакуль што апошні фільм «Ірацыянальны чалавек» толькі на днях перастаў паказвацца ў сталічных кінатэатрах), ужо з заўтрашняга дня можна ў **камедыі Німа Нурызадэ «Ультраамерыканцы»**, самаўпэўнена названай самай «забойнай» экшан-камедыяй лета. Фабула сапраўды камічная — работнік бензакалонкі Майк Хоўэл, што забаўляецца коміксамі і лёгкімі наркотыкамі, быццам забыў, што некалі быў спецагентам. Фільм абяцае яму пра гэта нагадаць.

На верасноўскім вялікім экране можна будзе ўбачыць непараўнальную Мэрыл Стрып, але на гэты раз нічога не нагадае пра яе вобразы ў фільмах кшталту «Выбар Сафі» ці «Масты акругі Мэдысан». У **камедыі «Рыкі і флэш» Джонатана Дэме**, што выйдзе ў пракат 10 верасня, актрыса іграе экстравагантную асобу (выгляд адпаведны), што нечакана вяртаецца да мужа і дзяцей, з якімі не жыла некалькі гадоў. Слоган — «калі мама маладзейшая за дачку». У пераносным сэнсе, вядома ж.

Калі вы чыталі славуты «Дэкамерон» Джавані Бакача, напісаны ў XIV стагоддзі, а таксама бачылі таленавітую экранізацыю 1970 года італьянскага рэжысёра Паола Пазаліні, вам будзе цікава ацаніць чарговы праект, натхнёны сярэднявечным матэрыялам. Пір падчас чумы — па сюжэце тры хлопцы і сем дзяўчат уцякаюць у вёску ад «чорнай смерці» і, каб прабавіць час, расказваюць адно аднаму гісторыі, пераважна пра каханне ў розных яго праявах. Гэтыя апавяданні становяцца асновай кнігі і адпаведна — фільма. **Новая экранізацыя «Дэкамерон»** створана італьянскімі рэжысёрамі братамі Віторыа і Паола Тавіяні, неаднаразова адзначанымі ўзнагародамі Канскага кінафестывалю, у тым ліку Залатой пальмавай галінай. Пракат фільма стартуе 24 верасня.

Кінематаграфісты ЗША і Вялікабрытаніі аб'ядналіся, каб паводле рэальных падзей стварыць карціну пра паскарэнне галоўнай вяршыні нашай планеты — Эверэста. Прафесійны скалалаз Роб Хол збірае каманду, каб здзейсніць сваю мару і трапіць на вяршыню славутай гары. Мэтанакіраваную кампанію не палохаюць трагічныя падзеі мінулага; прадказальна, што шлях наверх героям таксама не будзе простым. **Карціна рэжысёра-ісландца Бальтасара Кармакура «Эверэст»** будзе паказвацца з 24 верасня.

**2.** Cinemascope вяртаецца з канікулаў, а разам з ім на вялікі экран кінатэатра «Ракета» прыходзяць найлепшыя дасягненні сусветнага кінематографа. Ужо з першага дня месяца праграма прапануе штодзённыя паказы без паўтораў. У спісе такія рэжысёры, як Альфрэд Хічкок, Інгмар Бергман, Мікеланджэла Антаніоні, Джым Джармуш, Стэнлі Кубрык, Раман Паланскі і іншыя.

Фільмы ў праграме сапраўды легендарныя. Чаго варты непераўсягнуты **хічкокаўскі трылер 1960 года «Псіха»**, па сюжэце якога маладая жанчына Мэрыян крадзе на працы вялікую суму грошай і на машыне ўцякае з горада. Хай гэта не будзе спойлерам, але ў фільме прысутнічае ўнікальная сцэна забойства. Створана яна ў асноўным сродкамі мантажу і здымалася без удзелу акцёра, што выконваў ролю забойцы (дарэчы, цікавага персанажа з пункту гледжання псіхалогіі). Нягледзячы на тое, што ў кадры глядач не ўбачыць уласна пранікнення нажа ў цела чалавека, самога забойцы і ўражальных для слабанервовых людзей момантаў, глядач зразумее сэнс эпізоду і адчуе халодны жах. Магія кіно. «Псіха» будзе паказаны 4 верасня.



Знакаміты кадр з фільма «Псіха» Альфрэда Хічкока.

Часам можна пачуць жартаўлівыя выказванні кшталту «нічога не адбываецца, як у французскім кіно». Але гэта не зусім адпавядае сапраўднаму становішчу спраў: у фільмах французаў паказваюцца глабальныя, маштабныя з'явы, але на другім, быццам фонавым плане. Іх можна заўважыць, калі не патанаць у сюжэтных перыпетыях, не купляцца на насычаны антураж, не паглыбляцца ў псіхалагічныя шуканні. **«Жуль і Джым» Франсуа Труфо** — фільм з рэтраспектывы французскага кіно праекта Cinemascope. Гісторыя любоўнага трохкутніка, у цэнтры якога ракавая жанчына Катрын (у выкананні Жанны Маро). Яна нечакана з'яўляецца ў жыцці сяброў — аўстрыйца Жуля і француза Джыма, што на пачатку XX стагоддзя жывуць бестурботным жыццём, вядуць звычайныя размовы, мараць пра будучыню. Катрын прыходзіць як рок, магчыма, і прадвеснік, а магчыма, і сімвал будучых жудасных падзей, якія парушаюць спакой і перашкаджаюць здзяйсненню мар. Як і сама гераіня.

Рэтраспектыва французскага кіно будзе доўжыцца з 17 верасня да 4 кастрычніка і ўключыць у сябе стужкі Жана Рэнуара, Жака Таці, Рабэра Брэсона, Жан-Люка Гадара і іншых. Традыцыйна фільмы будуць паказвацца на мове арыгінала з рускімі субтытрамі.

Праект Cinemascope, акрамя іншага, арганізуе ў кінатэатры «Масква» паказ адрэстаўраванай версіі **фільма Рыдлі Скота «Бягучы па лязе»**. Пракатная версія была аднаўлена і дапоўнена сцэнамі, якіх не ставала. Сапраўдны рэжысёрскі варыянт фантастычнага фільма будзе паказвацца з 10 па 13 верасня. Нядаўна такім жа чынам у «Маскве» можна было паглядзець «Тэрмінатара» Джэймса Кэмерана, а ў кастрычніку будуць арганізаваны паказы дзвюх легендарных гісторый пра Марці Макфлая — фільмаў «Назад у будучыню» і «Назад у будучыню-2» Роберта Земекіса.

**3.** Кінатэатр «Перамога», што ў летні перыяд быў закрыты на рэканструкцыю, ужо 14 верасня адчыніць свае дзверы. Серыя паказаў «Лістапад. Калекцыя», што прадстаўляе мінскаму гледачу сучаснае еўрапейскае аўтарскае і жанравае кіно, увахodзіць у сезон разам са сваёй традыцыйнай пляцоўкай з дзвюма навінкамі.



Фільм «Скандынаўскі фарсаж».

З 14 верасня ў пракаце скандынаўскі фільм пра гонкі. Мы прызвычаіліся да галівудскіх «Фарсажа» і «Перавозчыка» (апошні, дарэчы, таксама ў верасноўскай афішы), прыйшоў час ацаніць нарвежскі адпаведнік — **«Скандынаўскі фарсаж»**. Анатацыя захапляе сваёй галівудскасцю: галоўны герой Рой павінен зрабіць неверагодная дзеля таго, каб даказаць сваю вартасць як гоншчыка ў той час, як наспяваюць сямейныя праблемы. Удзел у гонцы «Паўночны мыс» расставіць усе кропкі над «і», а глядач зможа параўнаць скандынаўскі баявік з амерыканскім.

**Крымінальная драма «Вікторыя» Себасцьяна Шыпера** знята адным дублем, не мае ніводнай мантажнай склейкі і ў той жа час паказвае палову Берліна і захапляльную гісторыю. Такая карціна не магла застацца без фестывальнай увагі, таму на апошнім «Берлінале» атрымала адразу некалькі прызоў, у тым ліку Сярэбранага мядзведзя за значныя мастацкія дасягненні. Па сюжэце маладая іспанка пасля клуба знаёміцца з чатырма хлопцамі і мімаволі становіцца саўдзельніцай абрабавання банка. Калі гаворка ідзе пра гэты фільм, нельга абысці імя Стурлы Бранта Гроўлена. Гэта апаратар, дзякуючы якому неверагодны з тэхнічнага пункту гледжання праект змог атрымацца. «Вікторыя» будзе паказвацца з 21 верасня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# СПАЖА — ХЛЕБА ДЗЯЖА




**Па гарызанталі: 1.** Едзеш на дзень — хлеба бяры на ... (прык.). **2.** «Тым часам маці тарапліва \\ Закон дзядовы свой спаўняе: \\ Кладзе кусочак хлеба з соллю \\ Пад красны кут у ...». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля» («Пярэбары»). **8.** Эпізод з кінафільма. **9.** Азімыя збожжавыя культуры; звычайна пасля трэццяга Спаса (29 жніўня) пачыналася іх сяўба. **10.** ... сноп ці сто коп — хлеба на год (прык.). **13.** Кладзі гной у пару, збярэш ... гару (прык.). **14.** Неабрэзаны край дошкі. **18.** Не вялік ..., ды ўсё ж такі птушка (прык.). **19.** «Плывуць на шляхах Беларусі\\... чырвоныя з хлебам». З верша Я.Купалы «Новая восень». **20.** Апрацоўка гліняных вырабаў высокай тэмпературай. **21.** Калектыўная дапамога пры выкананні сельскагаспадарчых работ. **23.** Запал, заўзятасць. **27.** «Хлеб — знак любові і духоўнага багацця, \\ З чым і жыве пад сонцам ...». З верша М.Курылы «Песня пра хлеб». **28.** Насякомае-паразіт; некалі на трэці Спас да ўсходу сонца праводзілі абрад іх выгнання з хаты. («Прыйшоў Спас, штоб не было ... у вас» (прык.). **30.** Доўгі капец сіласу, бульбы. **31.** Спас памілуе нас, а ... прынясе нам хлеба чыстага (прык.). **32.** Нізіннае месца.

**Па вертыкалі: 1.** Спажа — хлеба ... (прык.; Спажа́ — адна з назваў Прачыстае). **3.** Плады, якія апалі ад ветру ці ў час навальніцы. **4.** Красна поле снапамі, а ... — умалотам (прык.). **5.** Рака ў Францыі. **6.** Калі хлеба край, дык і пад елкай ... (прык.). **7.** Пільнуй гаспадаркі — будзе хлеб, будуць і ... (прык.). **11.** Магічныя словы, якія валодаюць гаючай або чароўнай сілай. **12.** Невялікі літаратурны твор. **15.** Калі ... ёсць, мужыку не пост (прык.). **16.** У каго чорна глыба, у таго і хлеба ... (прык.). **17.** «Наш хлеб — жыцця аснова, \\ Працяг і ...». З верша П.Панчанкі «Хлебныя словы». **21.** Абоз перасяленцаў. **22.** Тое, што і земляроб. **24.** Мінерал з групы сілікатаў. **25.** Сёння не пахмурна, а .... **26.** Ластаўкі адлятаюць у ... Спасы, жоравы — да трэцяга Спаса (прык.). **29.** Тэхнічная сельскагаспадарчая культура; паспявала да трэцяга Спаса, таму апошні называлі яшчэ не толькі арэхавым і хлебным, а і льняным.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Два. 2. Завуголле. 8. Кадр. 9. Азіміна. 10. Адзін. 13. Збожжа. 14. Абза. 18. Кулік. 19. Абозы. 20. Апал. 21. Талака. 23. Азарт. 27. Беларус. 28. Клоп. 30. Бурт. 31. Прачыстая. 32. Ніз. **Па вертыкалі:** 1. Дзяжа. 3. Апад. 4. Гумно. 5. Луара. 6. Рай. 7. Прываркі. 11. Замова. 12. Нарыс. 15. Бульба. 16. Скіба. 17. Барацьба. 21. Табар. 22. Араты. 24. Тапаз. 25. Ясна. 26. Тры. 29. Лён.

## Даты Падзеі Людзі

### 28 ЖНІЎНЯ



**1749** год — нарадзіўся Іаган Вольфганг Гётэ, нямецкі паэт, мысляр і прыродазнавец. Іаган рана пачаў чытаць, да сямі гадоў ужо ведаў лаціну і грэчаскую мову. У 16 гадоў Гётэ адправіўся ў Лейпцыгскі ўніверсітэт на юрыдычны факультэт. Аднак вучоба на юрыста яго не цікавіла, ён захапіўся літаратурай і мастацтвам і неўзабаве з'ехаў дадому. Затым ён становіцца студэнтам Страсбургскага ўніверсітэта. Там, у сілу сваёй дапытлівасці, Гётэ захапляецца медыцынай, шмат чытае, вывучае прыродазнаўчыя навукі. У 1769 годзе юнак выдае першую кнігу сваіх вершаў. Неўзабаве ён становіцца адным з ідэолагаў літаратурнага руху «Бура і націск», які стаў папулярным у Германіі. Прыхільнікі руху лічылі галоўнай задачай аўтара стварэнне ў вобразе героя валявой, моцнай асобы. Разам з тым Гётэ быў не толькі вялікім пісьменнікам і паэтам, але і прыродазнаўцам. Ім быў выкананы шэраг работ па параўнальнай марфалогіі раслін і жывёл, па фізіцы, геалогіі і мінералогіі, медыцыне. Памёр ён 22 сакавіка 1832 года ў Веймары. Гётэ ўвайшоў у гісторыю як найбуйнейшы паэт і ўніверсальны геній нямецкай літаратуры.

**1937** год — нарадзіўся (вёска Васілішкі, цяпер Шчучынскі раён) Іосіф Міхайлавіч Багдзевіч, беларускі вучоны ў галіне аграхіміі і радыеэкалогіі, акадэмік НАН Беларусі (2003), акадэмік Акадэміі аграрных навук Беларусі (1994), замежны член Украінскай акадэміі аграрных навук (2002), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1997). Аўтар больш як 400 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій, 29 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходкі. Пад яго кіраўніцтвам ажыццёўлены комплекс мерапрыемстваў па павышэнні ўрадлівасці глеб і эфектыўнасці ўгнаенняў у краіне. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002).

**1941** год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ «Аб перасяленні немцаў, якія пражываюць у раёнах Паволжа». Указ змяшчаў абвінавачанні насельніцтва савецкай Аўтаноміі немцаў Паволжа ў дапамозе «шматлікім шпіёнам і дыверсантам», якія нібыта былі засланы гітлераўцамі ў гэты рэгіён СССР. Сталінскае кіраўніцтва пастанавіла даручыць НКУС выселіць усіх паволжскіх немцаў у Сібір, Казахстан і Сярэднюю Азію. Дэпартацыя праходзіла з 3-га па 20 верасня 1941 года. Практычна ўся маёмасць перасяленцаў (дамы, жывёла і хатні скарб) былі канфіскаваны. Браць з сабой дазвалялася толькі тое, што можна было б перанесці ў руках. На новым месцы людзей часцяком выгружалі з эшалонаў у голы стэп. У першую ж зіму многія з іх (асабліва дзеці і старыя) загінулі ад голаду і холаду. Толькі ў 1964 годзе ў закрытым Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР афіцыйна былі прызнаны неабгрунтаванымі ўсе абвінавачанні ў адрас савецкіх немцаў, пасля чаго павольна і непаслядоўна пачалося аднаўленне іх грамадзянскіх правоў. Яно зацягнулася на многія гады.

### Было сказана

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**
*«Без змагання і няўдач нічога не даецца на свеце».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

РЫБАЛОЎНЫ промысел заўсёды быў нядрэннай дапамогай селяніну. Каб забяспечыць добры ўлоў, у народным асяродку існаваў цэлы шэраг правілаў, парушаць якія было непажадана.

◈ Тыя, хто займаўся рыбалоўным промыслам, пільна сачылі, каб ніткі на будучую сетку сукала менавіта цяжарная жанчына і менавіта пад поўню.

◈ Неабходна было абавязкова ссукаць некалькі нітак у дзень ушанавання святога Аляксея, чалавека Божага (30 сакавіка), які лічыўся ахоўнікам рыбакоў.

◈ Сеткі, як і ўсе астатнія рабалавецкія прылады, таксама майстравалі пад поўню, каб у іх заўсёды было поўна рыбы.

◈ Лічылася, што змайстраваць «шчаслівую» вуду можна з алешыны, якая расце з мурашніка ці побач з ім.

◈ Як абярэг у сеткі клалі невялікі кавалак хлеба з чацвярговай соллю.

◈ На рыбалку ішлі пад'еўшы, бо лічылася, што пашанцуе толькі сытаму.

◈ Сустрэча перад рыбалкай з замужняй жанчынай ці святаром прадказвала няўдалы ўлоў.

◈ Лічылася, калі хадзіць на рыбалку ў адным і тым адзенні, не хваліцца ўловам і не расказваць аб тым, на што і як лавіў, то заўсёды будзеш з рыбай.

◈ Ніколі не лічыце спойманую рыбу — больш не зловіце ніводнай.

◈ Злавіўшы маленькую рыбку, яе неабходна было адпусціць са словамі: «Пашлі бацьку, пашлі матку, пашлі цётку!»

◈ Перад тым, як ісці на рыбалку, раілі station паназіраць за станам месяца: «На маладзіку рыба бярэцца лепш за ўсё».

◈ У народным календары ёсць дзень, калі вялікім грахом лічылася есці і лавіць рыбу — 5 кастрычніка, у дзень ушанавання святога Іоны, — у памяць аб тым, як ён знаходзіўся ва чэраве кіта.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.10 | 20.10 | 14.00 |
| Віцебск — | 5.57 | 20.03 | 14.06 |
| Магілёў — | 6.00 | 20.01 | 14.01 |
| Гомель — | 6.00 | 19.54 | 13.54 |
| Гродна — | 6.25 | 20.25 | 14.00 |
| Брэст — | 6.29 | 20.22 | 13.53 |

### Месяц

*Поўня 29 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксея, Аркадзя, Васіля, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара.*
***К.** Монікі, Цэзара, Юзафа.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мужчына — мураваная сцяна, цвёрдая апора і несакрушальная ахова! Да таго часу, пакуль не ўбачыць на градусніку 37,5.**

Муж — жонцы:
— О, прыйшлі мае любімыя 50 кілаграмаў!
— Наогул ўва мне 56...
— Ну, значыць, я нешта ў табе недалюбліваю.

**Гуляў на камп'ютары ў рыбалку. Паставіў рэалістычнасць на максімум. У выніку дзве гадзіны тупа праседзеў перад экранам. Не бралася.**

Суседка сустракае хлопчыка, які ідзе са школы:
— Як жыццё, Вовачка?
— Нармальна.
— А ў школе як?
— Нармальна.
— А здароўе як?
— Нармальна.
— Слухай, а ў тваім лексіконе ёсць іншыя словы, акрамя гэтага «нармальна»?
— Тата сказаў, што дарослым нельга казаць «Ідзі да чорта»...

**Вось патлумачце мне. Чаму дарожная разметка, зробленая прафесіяналамі, ужо праз пару месяцаў амаль злазіць, а надпіс на той жа дарозе, зроблены нейкім дурнем аб тым, што ён любіць сваю адзіную, другі год трымаецца?..**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3311.
Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12